

БЕЛАРУСКІЯ КНІГІ СТАЛІ ЗАПАТРАБАВАНЫМІ
9

ЦУКАР ЯК НАРКОТЫК
13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 СНЕЖНЯ 2023 г. СУБОТА № 249 (30129)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый ЧАБАТАР, першы намеснік міністра эканомікі:**

*«У гэтым годзе ў краіне рэалізуюцца 812 вытворчых праектаў агульным коштам каля 48 млрд рублёў і аб'ёмам інвестыцый на 2023 год — 6,2 млрд рублёў. У студзені — верасні рэалізацыя 61-го завершана, з іх 11 датэрмінова, аб'ём асвоеных інвестыцый за ўвесь перыяд іх рэалізацыі — больш за 4,5 млрд рублёў. Перспектыўныя і эфектыўныя вытворчасці, заснаваныя на выкарыстанні мясцовых рэсурсаў і нацэленыя на выпуск запатрабаваных відаў прадукцыі як на ўнутраным, так і на знешніх рынках, развітая сацыяльная і транспартная інфраструктура — прыярытэтныя кірункі развіцця нашай краіны».*

# СВЯТА РАДАСЦІ І НАДЗЕІ

**Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Раство Хрыстова 25 снежня**

Дарагія суайчыннікі!

Прыміце цёплыя віншаванні з Раством Хрыстовым.

Яркае свята Віфлеемскай зоркі кліча ўсіх вернікаў насустрач самаму цудоўнаму хрысціянскаму святу. Яно напаўняе сэрца вялікай радасцю і надзеяй, натхняе на добрыя справы, вучыць праяўляць спачуванне і любоў да бліжняга.

Каляды — час для шчырай малітвы ў храме і душэўных сямейных вечароў, доўгачаканых дзіцячых падарункаў і ўсвядомленай дабрачыннасці, падвядзення вынікаў і складання планаў на будучыню. Перакананы, аб'яднаныя вернасцю да сваёй роднай Беларусі, разам мы зробім усё магчымае, каб кожны яе жыхар адчуваў сябе запатрабаваным і шчаслівым.

Жадаю вам моцнага здароўя, поспехаў і аптымізму. Няхай цудоўная атмасфера гэтых дзён стане невычэрпнай крыніцай духоўнай сілы на наступны год.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Маленькія прыхаджане архікатэдральнага касцёла Найсвяцейшай Панны Марыі ў Мінску прыйшлі наведаць немаўля Езуса ў традыцыйнай каляднай батлейцы.

## КОРАТКА

- **У рамках акцыі «Нашы дзеці» прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка наведаў РНПЦ траўматалогіі і артапедыі.**
- Новыя трактары BELARUS атрымалі дзесяць муніцыпалітэтаў Кузбаса.
- **Косаўскі палац сёлета наведалі больш за 100 тысяч турыстаў.**
- ААТ «Завод «Эвістар» павялічыла вытворчасць на 44,3 працэнта і на 46,6 працэнта — экспарт.
- **Беларускага дыпламата ў Бразіліі ўзнагародзілі тытулам «Пасол года».**
- «Чужых дзяцей не бывае». Старшыня канцэрна «Беллеспаперапрам» прывёз падарункі бабруйскім школьнікам.

Класныя навіны

## КАНІКУЛЫ: І ЗАХАПЛЯЛЬНА, І ПАЗНАВАЛЬНА...

**Кожная ўстанова адукацыі ўжо прадчувае навагоднюю атмасферу: і з дапамогай афармлення, і дзякуючы распрацаванай вялікай канікулярнай праграме. Бо з 24 снежня ў беларускіх школьнікаў пачынаюцца працяглыя зімовыя канікулы. Размова ідзе не толькі пра забаўляльныя мерапрыемствы. Былі загадзя спланаваны цікавыя экскурсійныя паездкі, краязнаўчыя квэсты. Прадумана валанцёрская дзейнасць. Шмат увагі аддадзена спартыўным мерапрыемствам. Добра было б, каб яшчэ і надвор'е парадавала снежнымі краявідамі і дазволіла заняцца зімовымі відамі спорту...**

СТАР. 11



ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



Парламенцкі дзённік

# ДЗЕЛЯ КАНКРЭТНАГА ЧАЛАВЕКА І ДЗЯРЖАВЫ Ў ЦЭЛЫМ

Члены Савета Рэспублікі адобрылі шэраг законапраектаў

**Сярод іх — «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь», «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб інвестыцыях», «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці» і іншыя.**

## АБАРОНА ДЗЯЦЕЙ АД ПЕДАФІЛАЎ

Праектам Закона «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці» карэкціруюцца Крымінальны, Крымінальна-працэсуальны і Крымінальна-выканаўчы кодэксы Рэспублікі Беларусь. Новаўвядзенні звязаны з удасканаленнем прававога рэгулявання грамадскіх адносін, якія складваюцца ў працэсе выканання крымінальных пакаранняў, а таксама забеспячэннем больш эфектыўнай абароны палавой недатыкальнасці непаўналетніх.

У прыватнасці, прадугледжваецца абавязковасць прэвентыўнага нагляду для асоб, судзімых за ўчыненне ў адносінах да малалетніх злачынстваў, па дасягненні 18-гадовага ўзросту. Устанаўліваецца абавязак названых асоб з'яўляцца ў арганізацыю аховы здароўя для праходжання прызначанага прымусовага лячэння. Прымяняюцца прымусовыя меры бяспекі і лячэння да асоб, якія пакутуюць на расстройства сексуальнай перавагі (педафілію) пры наяўнасці заключэння эксперта. Уводзіцца магчымасць аказання асуджаным псіхалагічнай дапамогі. Канкрэтызуецца і ўдакладняецца вылічэнне тэрмінаў адбывання пакарання.

Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ**, змяненні ўнесены невыпадкова. «На жаль, апошнім часам сфарміравалася негатыўная тэндэнцыя, звязаная з павелічэннем колькасці злачынстваў супраць палавой недатыкальнасці непаўналетніх грамадзян, — заўважыў ён. — За апошнія 10 гадоў колькасць выяўленых і зарэгістраваных злачынстваў у гэтай сферы вырасла больш як у дзесяць разоў. Калі ў 2012 годзе было зарэгістравана 38 такіх злачынстваў, то ў 2022 годзе іх колькасць склала 1089. Тое, што дзяржава рэагуе на такую негатыўную тэндэнцыю, максімальна аптымізуе крымінальнае пакаранне ў адносінах да асоб, якія здзейснілі дадзеныя цяжкае злачынства, з'яўляецца сведчаннем таго, што пытанне знаходзіцца на кантролі праваахоўных органаў. Спадзяёмся, дзякуючы гэтым мерам атрымаецца праламіць тэндэнцыю ў станоўчы бок».

## УМАЦАВАННЕ МІЖНАРОДНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

Члены Савета Рэспублікі адобрылі ратыфікацыю пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі аб узаемным прызнанні банкаўскіх гарантый пры ажыццяўленні дзяржаўных (муніцыпальных) закупак, аб міжнародных аўтамабільных перавозках.

Па словах **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Валерыя ГАЙДУКЕВІЧА**, пагадненне аб узаемным прызнанні банкаўскіх гарантый пры ажыццяўленні дзяржаўных (муніцыпальных) закупак дазваляе праводзіць электроннае афармленне дакументаў банкаўскіх гарантый нашых банкаў пры дзяржаўных закупках на дзяржаўным і муніцыпальным узроўнях. «Што датычыцца пагаднення аб міжнародных аўтамабільных перавозках, нашы будаўнікі ўзводзяць аб'екты на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі і не могуць выкарыстоўваць сваю тэхніку, — патлумачыў неабходнасць ратыфікацыі сенатар. — Пасля ратыфікацыі гэтае пытанне будзе наладжана. Усё робіцца для таго, каб палепшыць адносіны і зменшыць праблемы з афармленнем і ажыццяўленнем работ».

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ** выступіў з дакладам аб асноўных выніках міжпарламенцкай дзейнасці Савета Рэспублікі ў бягучым годзе. «У 2023 годзе міжпарламенцкая дзейнасць Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ажыццяўлялася ва ўмовах маштабных геапалітычных пераўтварэнняў — пераходу да шматпалярнай сістэмы міжнародных адносін, — адзначыў ён. — Бягучая геапалітычная сітуацыя характарызуецца высокім узроўнем канфліктнасці, спробамі заходніх краін на чале з ЗША захаваць сваё сусветнае панаванне, у тым ліку шляхам вядзення гібрыдных войн, падсілкоўвання ўзброеных канфліктаў, беспрэцэдэнтнай санкцыйнай палітыкі».

У завяршэнні пасяджэння сесіі **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** звярнула ўвагу на важнасць удзелу сенатараў у рэспубліканскіх акцыях «Нашы дзеці» і «Ад усёй душы», давяла да членаў Савета Рэспублікі інфармацыю аб выніках нарады ў кіраўніка дзяржавы па пытаннях удасканалення сістэмы рэгулявання і кантролю за цэнамі, якая напярэдадні адбылася ў Палацы Незалежнасці. Спікер верхняй палаты парламента паставіла задачу — трымаць на кантролі даручэнні Прэзідэнта. Пры гэтым асаблівы акцэнт рабіць на прадукцыі айчынных вытворцаў. Таксама Наталля Качанава давяла інфармацыю аб пытаннях, якія абмяркоўваліся на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, і анансавала нараду па правядзенні чарговага Форуму рэгіёнаў, які ў наступным годзе прыме Віцебшчына.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ПРАДУМАНЫЯ І ЎЗВАЖАНЫЯ РАШЭННІ

Дэпутаты завяршылі маштабную работу па прывядзенні заканадаўства ў адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй

**Кропка ў гэтым важным і адказным працэсе пастаўлена з разглядам такіх законапраектаў, як «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь» і «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб інвестыцыях». Такім чынам, створана ўся неабходная прававая база для правядзення выбараў дэпутатаў усіх узроўняў, членаў Савета Рэспублікі і правядзення Усебеларускага народнага сходу.**

## «НАРОШЧВАЦЬ РАБОТУ І ПРАЦАВАЦЬ НА РАЗВІЦЦЁ КРАІНЫ»

У цэлым, як у размове з журналістамі звярнуў увагу **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**, адыходзячы год быў прадукцыйны ў плане заканадаўчай дзейнасці. «Намі прынята каля 100 законапраектаў, — удакладніў ён. — Гэта законы, якія накіраваны на забеспячэнне перш за ўсё нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, развіццё эканомікі, сацыяльнай абароны грамадзян. Безумоўна, асноўным прыярытэтам у рабоце дэпутацкага корпуса было прывядзенне заканадаўства ў адпаведнасць з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь даручыў менавіта цяперашняму складу дэпутацкага корпуса правесці ўсю неабходную работу па карэкціроўцы нашага заканадаўства».

У выніку гэтай работы распрацаваны два новыя законапраекты: Закон «Аб Усебеларускім народным сходзе» і «Аб асновах грамадзянскай супольнасці». У адпаведнасць з абноўленай Канстытуцыяй прыведзены 83 законы. Па словах спікера ніжняй палаты парламента, дэпутаты папрацавалі грунтоўна. «Прыняты прадуманыя, узважаныя рашэнні, а для гэтага патрабаваўся прафесійны і адказны падыход, — заўважыў ён. — Аднак гэта не азначае, што мы заканчваем нашу работу. Яна працягваецца. Сёння ў Палаце прадстаўнікоў на разглядзе знаходзіцца каля 20 новых законапраектаў».

У першым чытанні таксама прыняты законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі».

## УЗРОСТ — НЕ ПАДСТАВА ДЛЯ БЕСПАКАРАНАСЦІ

У першым чытанні дэпутаты адобрылі праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні законаў па пытаннях прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх». Дапаўняецца пералік катэгорый непаўналетніх, у адносінах да якіх праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа. Павялічваецца тэрмін, на працягу якога органы, установы і іншыя арганізацыі, якія ажыццяўляюць прафілактыку безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх, будуць праводзіць індывідуальную прафілактычную работу. Пашыраецца пералік падстаў для спынення такой работы. Акрамя таго, удакладняюцца ўмовы памяшчэння непаўналетніх у спецыяльныя выхаваўчыя ўстановы, умовы знаходжання ў іх. Таксама вызначаюцца ўмовы прыёму непаўналетніх у спецыяльныя выхаваўчыя ўстановы па заявах іх бацькоў (усынавіцеляў, удачарыцеляў), апекуноў або папячыцеляў.

Як адзначыў **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ**, новая рэдакцыя закона дазволіць ізаляваць правапарушальнікаў пасля здзяйснення чатырох адміністрацыйных дзеянняў незалежна ад мер спагнанняў і ўзросту правапарушальніка. «Дадаткова ўводзіцца асобная норма змяшчэння непаўналетняга ў спецыяльную выхаваўчую ўстанову, — канкрэтызаваў кіраўнік міліцэйскага ведамства. — Яна датычыцца тых падлеткаў, якія пераступілі закон і ў сілу ўзросту вызвалены ад крымінальнай адказнасці. Прапанаваныя падыходы дазволяць не дапусціць серыі супрацьпраўных учынкаў ад дзіцяці і пачынаць работу па папярэджанні на больш ранняй стадыі».

Па словах міністра, адной з падстаў для накіравання ў спецыяльную выхаваўчую ўстанову будзе з'яўляцца і факт жорсткага абыходжання дзяцей з жывёламі. Таксама законапраектам прадугледжана дапамога дзецям, якія пакутуюць ад алкагольнай і наркатычнай залежнасці. «Дадзеная работа будзе рэалізоўвацца шляхам накіравання іх у спецыяльную выхаваўчую ўстанову па заявах бацькоў, — паведаміў Іван Кубракоў. — З такімі падлеткамі арганізоўць мерапрыемствы комплекснай рэабілітацыі, якія ўтрымліваюць медыцынскі, псіхолага-педагагічны і адукацыйны кампаненты. Але самае галоўнае — непаўналетні будзе агароджаны ад негатыўнага асяроддзя, што, безумоўна, спрыяльна скажацца на працэсе яго рэабілітацыі».

Новаўвядзенні закрануць і законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях рэгулявання шлюбных і сямейных адносін». Замацоўваецца прававая норма, якая ўстанаўлівае асаблівасці правядзення медыцынскага агляду асоб, абавязаных пакрываць выдаткі, патрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні. Разглядаецца магчымасць адчужэння жылых памяшканняў (долі ў праве ўласнасці на жылое памяшканне), якія належаць абавязаным асобам, са згоды органа апекі і папячыцельства або на падставе рашэння мясцовага выканаўчага і распарадчага органа ў інтарэсах непаўналетніх дзяцей абавязаных асоб. Акрамя таго, мяняюцца падыходы да вызвалення працоўнага адпачынку абавязаным асобам, вызначэння арганізацый, у якія такія асобы будуць працаўладкоўвацца. Таксама канкрэтызуюцца падставы звальнення такіх асоб.

Падчас пасяджэння былі разгледжаны і новаўвядзенні ў заканадаўства аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці, па пытаннях рынку каштоўных папер, па пытаннях вытворчасці і абароту алкагольнай прадукцыі. Зацверджаны змяненні ў Паветраны кодэкс Рэспублікі Беларусь, кодэксы па пытаннях крымінальнай адказнасці. Ратыфікавана Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі аб узаемным прызнанні банкаўскіх гарантый пры ажыццяўленні дзяржаўных (муніцыпальных) закупак, Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі аб міжнародных аўтамабільных перавозках.

## РАЗМАЎЛЯЦЬ З ЛЮДЗЬМІ І ДБАЦЬ АБ ІХ ДАБРАБЫЦЕ

На завяршэнні апошняга ў гэтым годзе пасяджэння дзясятай сесіі Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання Уладзімір Андрэйчанка ўручыў узнагароды, ганаровыя граматы і падзякі дэпутатам. Таксама Старшыня Палаты прадстаўнікоў вызначыў прыярытэтныя кірункі дэпутацкай дзейнасці ў найбліжэйшы час і паставіў канкрэтныя задачы.

«Асноўныя вектары міжнароднай дзейнасці дэпутацкага корпуса на найбліжэйшую перспектыву ў многім вызначаюць вынікі нядаўніх візітаў Прэзідэнта Беларусі ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Кітай, Экватарыяльную Гвінею і Кенію, — заўважыў спікер. — Гэта паездка наглядна пацвердзіла той факт, што цэнтр сусветнага эканамічнага жыцця сёння імкліва перамяшчаецца ў краіны Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, Блізкага Усходу. Беларусь там запатрабавана як надзейны эканамічны партнёр і аднадумец у справе пабудовы больш справядлівага светаўладкавання. Дэпутацкаму корпусу трэба аператыўна падключыцца да рэалізацыі дасягнутых дамоўленасцяў. Гэта найперш задача нашых парламенцкіх груп сяброўства».

Наступныя два тыдні дэпутаты будуць працаваць у выбарчых акругах. «Нягледзячы на святы, гэта будзе вельмі насычаны з грамадска-палітычнага пункту гледжання час, — заўважыў спікер ніжняй палаты парламента. — Пачаты ўжо збор подпісаў за кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і мясцовыя Саветы дэпутатаў усіх узроўняў. Зразумела, што нам неабходна аказаць садзейнічанне мясцовым органам улады ў арганізацыйным плане, удзяліць увагу ў інфармацыйным суправаджэнні кампаніі: у правядзенні дыялогавых пляцовак, круглых сталоў, сустрэч з выбаршчыкамі ў працоўных калектывах і на асабістых прыёмах. Сустракаючыся з людзьмі, трэба растлумачваць значнасць электаральнай кампаніі, яе арганізацыйныя асаблівасці і неабходнасць прыйсці на ўчасткі для галасавання. Грамадзяне павінны разумець, што будучыня краіны і асабісты лёс кожнага беларуса сёння залежаць ад свядомага і адказнага выбару кожнага з нас».

Асаблівую ўвагу Уладзімір Андрэйчанка рэкамендаваў дэпутатам звярнуць на пытанні цэнаўтварэння, наяўнасці неабходнага асартыменту тавараў у гандлёвых пунктах і, што немалаважна, — на культуру абслугоўвання. Найперш гэта датычыцца малых населеных пунктаў. «Людзі, якія сваёй працай ствараюць дабрабыт Беларусі, заслугоўваюць таго, каб якасць іх жыцця ўвесь час паляпшалася, — падкрэсліў ён. — У цэлым наша задача — зрабіць усё, каб выбары прайшлі на высокім арганізацыйным узроўні, спакойна і ў поўнай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам».

**Вераніка КАНЮТА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў Мікалая Васільевіча СЕРГІЕНКІ і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

Нашы дзеці

## «РАБІЦЬ ДАБРО — У ГЕНАХ БЕЛАРУСАЎ»

У рамках акцыі «Нашы дзеці» Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА наведаў Бягомльскую дапаможную школу-інтэрнат

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў уручыў навагоднія падарункі дзецям-сіротам і дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў. Па яго словах, рабіць дабро — гэта ў генах беларусаў.**


Фота БелТА.

Установа адукацыі ажыццяўляе сваю дзейнасць з верасня 1960 года. Тут створаны ўсе ўмовы для навучання, карэкцыі парушэнняў у развіцці і сацыяльнай адаптацыі выхаванцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю. У дапаможнай школе-інтэрнаце ажыццяўляецца прафарыентацыя яе выхаванцаў з улікам магчымасцяў вучняў і патрэбы рынку працы. Асноўная задача навучальнай установы — падрыхтоўка выхаванцаў да самастойнага жыцця, фарміраванне ў іх неабходных уменняў і навыкаў. Замацаваць атрыманыя веды, каб лепш адаптавацца ў сацыяльным асяроддзі, хлопчыкам і дзяўчынкам дапамагае маладзёжны цэнтр, які працуе на базе школы-інтэрната.

Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што ўдзяліць увагу дзецям — адзін з кірункаў палітыкі беларускай дзяржавы. Па яго словах, віншаваць дзяцей напярэдадні Новага года — гэта своеасаблівы нацыянальны брэнд. «Незалежна, дзе сёння дзеці — у сем'ях або ў школах-інтэрнатах, — дзяржава клапоціцца аб іх, — адзначыў спікер. — Чужых дзяцей для нашай краіны няма. Галоўнае багацце Беларусі — гэта людзі».

**Вераніка КАНЮТА.**

## НЕЛЬГА АБЫСЦІ ЎВАГАЙ НІВОДНАЕ ДЗІЦЯ

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА прыняў удзел у акцыі «Нашы дзеці» і павіншаваў выхаванцаў Маладзечанскай спецыяльнай школы-інтэрната з надыходзячымі святамі, паведаміла БелТА.**


Фота БелТА.

Дзеці падрыхтавалі для гасцей праграму «У пошуках Дзеда Мароза». Навучэнцы і госці школы-інтэрната вадзілі карагод каля ёлкі і ўдзельнічалі ў конкурсах. На заканчэнне свята Ігар Сергеенка павіншаваў дзяцей з надыходзячым Новым годам і ўручыў кожнаму дзіцяці падарунак, а ўстанове адукацыі — гульнявы вулічны комплекс.

«Сустрэчы тут, у Маладзечне, напярэдадні Новага года становяцца ўжо традыцыйнымі. Я ўдзячны за запрашэнне пабываць у вас у гасцях, вярнуцца ў казку, дзе тыя ж героі, якія былі 20, 30, 40 гадоў таму. Але вы ў гэту казку ўдыхнулі свае ідэі, свае словы, сваю творчасць, — заўважыў Ігар Сергеенка. — У гэтым годзе вы прыраслі спартыўнымі вынікамі, поспехамі ў вучобе, творчымі перамогамі. Ваш утульны дом, у якім вы працуеце і жывяце, стаў яшчэ больш утульным. І знешне ён стаў яшчэ больш прыгожым, вясёлым».

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта выказаў удзячнасць педагогам і настаўнікам, якія пакідаюць тут часцінку душы. «Па-іншаму і быць не можа. Працаваць з дзецьмі не могуць людзі, якія бяздушна ставяцца да сваёй прафесіі. І сапраўды ваша школа з'яўляецца абласным цэнтрам падрыхтоўкі і навучання дзяцей з парушэннямі зроку. У наяўнасці рух наперад. Але самае галоўнае, што вы ствараеце тут атмасферу творчасці, утульнасці», — дадаў ён. Ігар Сергеенка павіншаваў усіх з Новым годам. «Гэта свята для ўсіх. Кожны яго чакае», — упэўнены кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

У размове з журналістамі Ігар Сергеенка выказаў меркаванне, што акцыя «Нашы дзеці» — цудоўная традыцыя, якая зарадзілася больш як 20 гадоў таму па ініцыятыве кіраўніка дзяржавы і з кожным годам набірае вялікія абароты. «Гэта акцыя вызначаецца насычанасцю, якасцю. Нельга абысці ўвагай ніводнае дзіця», — лічыць ён.



# «Слова сталася целам»

## З паслання на Урачыстасць Нараджэння Пана 2023 года

Абвяшчэнне таямніцы Божага Нараджэння — заўсёды новае і актуальнае, заўсёды дзіўнае і радаснае, таму што яно пераўзыходзіць усе нашыя самыя смелыя спадзяванні. Перш за ўсё таму, што гэта не проста чутка, а сапраўдны факт, гэта падзея, аб якой распавялі нам вартыя даверу сведкі, якія на свае вочы ўбачылі Езуса з Назарэта. Знаходзячыся побач з Ім, назіраючы за Яго сталеннем, Яго дзеяннямі і слухаючы Яго словы, сведкі Евангелля прызналі Езуса Хрыста Месіяй. Убачыўшы Яго ўваскрослым пасля ўкрыжавання, яны цалкам пераканаліся, што Хрыстус, сапраўдны Чалавек, які паходзіць ад Айца, поўны ласкі і праўды (пар. Ян 1, 14).

«Слова сталася целам»! Слова і цела — гэта дзве супрацьлеглыя рэальнасці, таму слушна ў свой час папа Бэнэдыкт XVI задаў пытанне: «Як можа вечнае і ўсемагутнае Слова стаць слабым і смяротным чалавекам?» Адказ ёсць толькі адзін: так учыніла Любоў. Той, хто любіць, хоча ўсім дзяліцца са сваім любым, хоча быць у еднасці з ім. Таму ў Святым Пісанні паказваецца доўгая гісторыя любові Бога да свайго народа, любові, якая, па словах святога Яна Паўла II, «дасягнула сваёй вяршыні ў Езусе Хрысце».

Уцелаўленне Сына Божага — гэта падзея, якая адбылася ў канкрэтны момант гісторыі, але ў той жа час выходзіць па-за яе межы. І гэта не проста факт, які адбываецца сам па сабе, незалежна ад нас: прыняцце гэтай Праўды патрабуе нашай веры — нашага «так», выказанага сэрцам.

Чаго сапраўды шукае нашае сэрца, як не Праўды? Яе шукае кожнае дзіця, задаючы бацькам і выхавацелям шматлікія пытанні; яе шукае малады чалавек, які жадае знайсці глыбокі сэнс жыцця; яе шукаюць усе мужчыны і жанчыны, імкнучыся спраўляцца са сваімі абавязкамі ў сям'і і на працы; яе шукае кожны пажылы чалавек, каб мець адчуванне паўнаты зямнога існавання.

«Слова сталася целам...» Штогадовае святкаванне ўрачыстасці Божага Нараджэння — гэта свята для народаў, для супольнага шляху чалавецтва. Няхай свята Божага Нараджэння зноў заяснее і натхніць нас на пошукі справядлівага і мірнага суіснавання. Няхай абнадзейлівае пасланне прыйсця Эмануэля супакоіць усялякі боль і суцешыць кожнага з нас у цяжкіх выпрабаваннях, даючы сілы і надзею на будучыню ўсім людзям добрай волі.

Святы Божага Нараджэння і наш актыўны ўдзел у іх, перыяд Калядаў можа стаць своеасаблівым «пятым Евангеллем», якое мы пішам жыццём веры ў сённяшнім свеце. Давайце рабіць гэта мужна, нават калі здараюцца памылкі! Давайце абвяшчаць свету Евангелле праз нашыя працягнутыя далоні ва ўчынках міласэрнасці, згодна з наказам Хрыста: «Тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі» (Мц 25, 40).

Божае Нараджэнне — гэта ўнікальная ўрачыстасць для сям'і. Гэта не свята прыбранай ялінкі ці зімовага сонцастаяння. Бог стаў Чалавекам, каб размаўляць з намі як Чалавек. Божае Нараджэнне — гэта найвялікшая падзея ў гісторыі чалавецтва, якой мы, вернікі, павінны быць заўсёды адданымі вестунамі. Падзеі ў Бэтлееме ў святую ноч з'яўляюцца жывым і яскравым сведчаннем таго, што Пан Бог, якога людзі заўсёды ўспрымалі як «далёкага, пагружанага ў вечнасць на вышынях», увайшоў у гісторыю чалавецтва абсалютна незаўважаным. Месцам свайго нараджэння Ён выбраў убогі хлеў на ўскраіне чалавечага жыцця і паўсядзённых спраў. Таму Ён і сёння выбірае месцы далей ад людскога шуму, ад крыкаў і спрэчак аб тым, хто важнейшы і ў каго больш правоў. Бог выбраў месца, дзе пануе цішыня, дзе ніхто нікога не прыгнятае, дзе выразна чуваць Яго ціхі голас.

Мае дарагія вернікі, у жыцці кожнага з нас ёсць нешта ад таго бэтлеемскага «заезду». Каб зразумець і адчуць Бога, які прыходзіць да нас, мы павінны перажыць навяртанне, у нас павінна адбыцца духоўная перамена. Нам патрэбны новы погляд на ўласнае жыццё, неабходна адбудаваць і ўмацаваць асновы нашага жыцця, каб не разбурыўся дом нашага чалавечага існавання. Час абвяшчэння Добрай Навіны не можа скончыцца з завяршэннем нашага святкавання Божага Нараджэння. Несці ў свет Евангелле і практыкаваць яго неабходна кожны дзень: бацькі павінны рабіць гэта сваім адказным клопатам аб каталіцкім выхаванні дзяцей; моладзь і дзеці — вернасцю ў сяброўстве з Езусам і сумленным выкананнем сваіх абавязкаў; хворыя і цярпячыя — ахвяраваннем сваіх цяжкасцяў Богу і яднаннем з Ім; урэшце, усе мы павінны старацца жыць згодна са сваім сумленнем і паклiканнем. Давайце пісаць нашае "пятае Евангелле" з мужнасцю, нават калі здараюцца памылкі. Бог і сёння прыходзіць да чалавека, хоць многія яшчэ не ведаюць пра гэта, як і ў Бэтлееме. Давайце прынясем гэты дар туды, дзе яго ніхто не чакае, на перыферыю чалавечага існавання, бо дзе б ні жыў чалавек, туды хоча прыйсці Бог, і Ён робіць гэта праз шлях нашага чалавечага сведчання веры.

**Арцыбіскуп Юзаф СТАНЕЎСКІ,**
**Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Чэхіі абвешчана нацыянальная жалоба пасля стральбы ў Карлавым універсітэце



23 снежня ў Чэхіі абвешчана нацыянальным днём жалобы ў памяць аб ахвярах трагічнай стральбы, якая адбылася 21 снежня на філасофскім факультэце Карлавага ўніверсітэта ў Празе. Пра гэта паведаміла чэшская газета Denik. Адпаведнае рашэнне ўрад прыняў на пазачарговым пасяджэнні, на якім прысутнічаў прэзідэнт Пётр Павел. Прэм'ер-міністр Чэхіі Пётр Фіяла заклікаў грамадзян ушанаваць памяць ахвяр трагедыі хвілінай маўчання ў дзень нацыянальнай жалобы. У сваёй заяве прэм'ер-міністр адзначыў: «Мы ўсе шакіраваны гэтым жахлівым актам. Цяжка знайсці словы, каб выказаць асуджэнне, з аднаго боку, і, з другога, боль і смутак, якія адчувае ўсё наша грамадства ў гэтыя дні перад Калядамі». У выніку стральбы загінулі 15 чалавек, уключаючы нападніка. Акрамя таго, 25 чалавек атрымалі раненні, 10 з іх — сур'ёзныя траўмы. Падазроны — 24-гадовы студэнт факультэта Давід Козак з вёскі Хастунь. Паводле даных паліцыі, малады чалавек старанна планаваў масавае забойства ў навучальнай установе. Ён пісаў у сацсетках аб сваім намеры здзейсніць «скулшутынг». «Гэта адзін з самых страшных масавых расстрэлаў у найноўшай гісторыі Еўропы», — адзначыла «ВВС». Нападнік, які, паводле слоў паліцыі, быў «ліквідаваны», як мяркуюць, таксама забіў свайго бацьку і можа быць звязаны са смерцю двух чалавек на мінулым тыдні. Падазроны не меў судзімасці. Перад стральбой у паліцыю паступіла паведамленне, што малады чалавек, як мяркуецца, накіроўваецца ў Прагу з суседняга горада з намерам пакончыць з сабой. Праз некаторы час бацька мужчыны быў знойдзены мёртвым. Паліцыя эвакуіравала другі будынак універсітэта, дзе падазроны павінен быў прысутнічаць на лекцыі, але неўзабаве сілавікоў выклікалі ў галоўны будынак факультэта непадалёк.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні народу Чэхіі ў сувязі з ахвярамі стральбы ў Празе. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. «Да глыбіні душы шакіраваны жахлівай трагедыяй, якая здарылася 21 снежня ў Празе. Масавае забойства ні ў чым не вінаватых людзей у цэнтры адной з еўрапейскіх сталіц уражвае цынізмам і бессэнсоўнасцю. Рашуча асуджаем гэты бесчалавечны акт гвалту, які патрабуе належнага асэнсавання з боку ўлады і рэакцыі дэмакратычнай грамадскасці Чэхіі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

### Аналітыкі заявілі аб рэкорднай за апошнія 30 гадоў колькасці рэгіянальных канфліктаў

Паводле дадзеных брытанскага Міжнароднага інстытута стратэгічных даследаванняў (IISS), сёлета па ўсім свеце адбылося не менш за 183 рэгіянальных канфлікты. Гэта найвышэйшы паказчык за апошнія 30 гадоў. Паводле дадзеных IISS, інтэнсіўнасць канфліктаў у свеце расце з году ў год. Паводле апошняй справаздачы, колькасць загінулых у параўнанні з мінулым годам павялічылася на 14 працэнтаў, а колькасць выпадкаў гвалту — на 28 працэнтаў. Паводле ацэнкі экспертаў, «гэта ўказвае на тое, што ў многіх частках свету сітуацыя становіцца ўсё больш праблематычнай з пункту гледжання гуманітарных патрэб, стабілізацыі і аднаўлення». Міжнародны камітэт Чырвонага Крыжа прадставіў звесткі пра больш чым 450 узброеных груповак, якія дзейнічаюць у свеце, частка якіх мае мясцовае або рэгіянальнае дамінаванне. У якасці прычын канфліктаў указваюцца ўнутраны тэрарызм, тэрытарыяльныя спрэчкі, рост колькасці злачынных груповак і крымінальнае саперніцтва.

Тонкасці прафесіі

# МАЙСТРЫ САПЁРНАЙ СПРАВЫ

## Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў Супрацьмінным цэнтры Узброеных Сіл і даведаліся, чаму тут шмат ахвотных служыць

**Цяпер у кожнага маладога чалавека, які збіраецца ісці ў армію, ёсць выбар — адслужыць тэрміновую ваенную службу або адразу заключыць з воінскім падраздзяленнем кантракт. І калі перспектыва першага варыянта ўсім зразумелая, то пра магчымасці кантрактнай службы ведаюць не ўсе. Нягледзячы на тое што замест года-паўтара несці воінскі абавязак трэба будзе 24 месяцы, усё больш прызыўнікоў аддае перавагу службе па кантракце.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Карэспандэнты «Звязды» пераканаліся ў гэтым, калі наведалі Супрацьмінны цэнтр Узброеных Сіл. У лістападзе спецыяльнае падраздзяленне, прызначанае для пошуку выбуховых рэчываў і іх размініравання, папоўнілі 30 навабранцаў. Усе — кантрактнікі. Ахвотных было амаль удвая больш, але добрая частка асабовага складу вырашыла працягваць службу далей.

### 3 фельчара — у вайскоўцы

— Мы ўвогуле не набіраем маладых людзей на тэрміновую ваенную службу, — уводзіць у курс справы **намеснік начальніка Супрацьміннага цэнтра Узброеных Сіл па ідэалагічнай рабоце падпалкоўнік Руслан ЛАБАНОЎСКІ.** — Падраздзяленне, у якім маладыя людзі праходзяць службу, з'яўляецца атрадам размініравання (гуманітарнага размініравання) і разлічана на выкананне ў тым ліку гуманітарных місій за межамі Рэспублікі Беларусь. Згодна з нашым заканадаўствам, ваеннаслужачыя тэрміновай службы не могуць выконваць задачы на тэрыторыі іншых краін. Нашы ваеннаслужачыя яшчэ нікуды не ездзілі, але калі будзе пастаўлена задача — натуральна, будзем яе выконваць.

Каб трапіць у Супрацьмінны цэнтр, аднаго жадання мала. Кандыдат у кантрактнікі праходзіць сур'ёзную комплексную праверку, якая прадугледжвае ацэнку не толькі фізічнага, але і псіхічнага здароўя. Паколькі ваеннаслужачыя падраздзялення рэгулярна працуюць з выбуханебяспечнымі рэчывамі, вельмі важна быць упэўненымі ў гэтых людзях. Невыпадкова пры адборы ўлічваюцца і маральна-дзелавыя якасці прызыўнікоў.

Уладзіслаў Куліда служыць у цэнтры дзявяты месяц. Малады чалавек родам з Нароўлі. Прызнаецца, што з дзяцінства марыў стаць вайскоўцам. Аднак лёс распарадзіўся інакш, і адразу пасля школы ён пайшоў у медыцыну. Скончыў Мазырскі дзяржаўны медыцынскі каледж, затым чатыры гады адпрацаваў фельчарам-лабарантам у цэнтральнай раённай бальніцы Жлобіна. Перыяд прафесійнай дзейнасці акурат прыпаў на ковід, калі яшчэ дакладна не ведалі, што гэта за інфекцыя і як з ёй змагацца. Калі прыйшла павестка ў армію, малады чалавек быў настроены аптымістычна: нарэшце збылася яго мара стаць ваеннаслужачым. Уладзіслаў прытрымліваецца прынцыпу, што ўвесь час варта спрабаваць нешта новае — так цікавей жыць. У ваенкамаце яму прапанавалі падумаць аб кантрактнай службе. Ён пагадзіўся. Па душы прыйшлася і перспектыва паслужыць у Супрацьмінным цэнтры Узброеных Сіл.

Як дэсантнікі памятаюць свой першы скачок з парашутам, так і сапёр — першы палявы выхад. «Упершыню размініраванне боепрыпасаў я праводзіў на Віцебшчыне, — расказвае Уладзіслаў Куліда. — Суцэльная ачыстка мясцовасці ажыццяўлялася на тэрыторыі былога Дрэтуньскага палігона. Знаходзілі неразарваныя боепрыпасы і абясшкоджвалі іх. Упэўненасць у рабоце надавала прысутнасць камандзіра групы, больш вопытнага сапёра. Падчас першай камандзіроўкі разам з ім мы размініравалі 200 боепрыпасаў, у перыяд другога палявога выхаду — каля 800».

### Цяжка ў навучанні — лёгка пры размініраванні

Перш-наперш ваеннаслужачыя кантрактнай службы праходзяць у цэнтры падрыхтоўку — не менш чым паўгода. Да размініравання іх допускаюць толькі пасля паспяховай здачы іспытаў. «Маладыя людзі, якіх мы прызываем, разумеюць, што будуць несці службу ў асобным падраздзяленні — такіх ва Узброеных Сілах больш няма, — звяртае ўвагу Руслан Лабаноўскі. — Сапёры выконваюць баявыя задачы ў мірны час. Займаюцца размініраваннем участкаў мясцовасці, якія насычаны выбуханебяспечнымі прадметамі яшчэ з перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Па заяўках, якія паступаюць у Міністэрства абароны, зносяць аварыйна-небяспечныя будынкі».

Рэгулярна выбуханебяспечныя прадметы на сваіх участках знаходзяць гаспадары прыватных хат. «Падарункі» Вялікай Айчыннай нярэдка выяўляюцца і на сельскагаспадарчых палетках. Спецыялісты Супрацьміннага цэнтра ведаюць, як спраўляцца з такімі «знаходкамі». У іх, дарэчы, свая зона адказнасці. Прафесійныя сапёры ёсць у кожным рэгіёне: усе яны прайшлі падрыхтоўку ў цэнтры. Спецыялістаў перасоўных груп размініравання тут рыхтуюць не толькі для Узброеных Сіл, але і іншых сілавых структур. Навучанне ажыццяўляецца па наступных спецыяльнасцях: сапёр, кіроўца-сапёр, кінолаг-сапёр і вадалаз-сапёр.

Выкладчыкі цэнтра — сапраўдныя майстры размініравання і падрыўной справы. За плячамі кожнага з іх — багаты вопыт, звязаны з абясшкоджваннем сотняў і нават тысяч выбуханебяспечных прадметаў. Спецыяльная падрыхтоўка сапёраў уяўляе сабой вывучэнне характарыстык боепрыпасаў шматлікіх сістэм, патрабаванняў бяспекі пры абыходжанні з імі, асвойванне механізмаў размініравання боепрыпасаў, падрыўной справы. У Супрацьмінным цэнтры для гэтага створаны ўсе ўмовы. Патрэніравацца сапёрныя здольнасці ў максімальна прыбліжанай да рэальнасці сітуацыі дазваляюць вучэбна-трэнажорныя комплексы. З дапамогай спецыяльных класаў, якія нагадваюць дзіцячы садок, школу, склад або кухню, ёсць магчымасць змадэляваць любую сітуацыю для работы групы па пошуку і абясшкоджванні выбуханебяспечных прадметаў. У сувязі са спецыяльнай ваеннай аперацыяй на Украіне ў навучальную праграму сапёраў унесены карэктывы.

### Заробак і рэгламентаваны працоўны дзень

Нягледзячы на тое што прафесія сапёра патрабуе фізічнай вынослівасці і заўсёды спалучана з рызыкай для жыцця, маладыя людзі актыўна заключаюць з воінскім падраздзяленнем кантракт. Што іх матывуе? У ваеннаслужачага кантрактнай службы добрае грашовае забеспячэнне — кажучы прасцей, ён і воінскі абавязак выконвае, і заробак атрымлівае. Улічваючы, што ў армію, як правіла, прыходзяць людзі без працоўнага вопыту і стажу, гэта няздрэнна. На салдат-кантрактнікаў распаўсюджваюцца ўсе сацыяльныя гарантыі, прадугледжаныя для ваеннаслужачых. Маладым людзям, якія арандуюць жыллё, кампенсуецца пэўная сума. Пагадзіцеся, такі «бонус» на цывільнай рабоце мала хто прапаноўвае. Вайскоўцы кантрактнай службы маюць права на поўнае медыцынскае забеспячэнне, пачынаючы ад стаматолага і заканчваючы любым хірургічным умяшальніцтвам. Створаны ўмовы для фізічнай падрыхтоўкі. Рэгламентаваны працоўны дзень — і з гэтым вельмі сочаць. Пасля заканчэння тэрміну службы многія застаюцца і заключаюць другі, трэці кантракт. Некаторыя становяцца курсантамі ваенных вышэйшых навучальных устаноў, у тым ліку Расійскай Федэрацыі, — служба ў арміі дазваляе паступаць па-за конкурсам.

У свой час гэтай прывілеяй скарыстаўся **начальнік цыкла супрацьдзеяння самаробным выбуховым прыстасаванням Супрацьміннага цэнтра Узброеных Сіл старшы лейтэнант Сцяпан ГРАДАЎ.** Яшчэ ў час праходжання ваеннай тэрміновай службы ў 72-м аб'яднаным навучальным цэнтры ён падаў дакументы ў Цюменскае вышэйшае ваенна-інжынернае каманднае вучылішча імя маршала А. Прашлякова. Адвучыўшыся пяць гадоў, малады чалавек размеркаваўся ў воінскую часць у Гродна. У Супрацьмінны цэнтр перавёўся ў маі 2022 года.

«Мне тут падабаецца, — прызнаецца Сцяпан Градаў. — Пастаянны адрэналін, каласальны вопыт, штодзённае ўдасканаленне. Сапёры — адны з нямногіх, хто выконвае баявыя задачы ў мірны час. Нягледзячы на тое што ва ўсіх цяпер баявая падрыхтоўка, навучанне, нашы ваеннаслужачыя працуюць з выбуховымі рэчывамі, знішчаюць боепрыпасы. Ёсць разуменне, што задачы, якія мы выконваем, надзвычай важныя. Кожны афіцэр і прапаршчык адчувае вялікую адказнасць перад падначаленым асабовым складам».

Калі мінчанін Ягор Хаменка заключаў з воінскім падраздзяленнем кантракт, ён добра ведаў, што такое армія. Паўтара года малады чалавек праходзіў тэрміновую ваенную службу ў 72-м аб'яднаным навучальным цэнтры. Некаторы час пасля дэмабілізацыі працаваў у цывільнай структуры. Зразумеў, што гэта не яго, і захацеў вярнуцца ў армію. Прайшоў сумоўе і трапіў у Супрацьмінны цэнтр. Шкадуе толькі аб адным: што не падпісаў кантракт з падраздзяленнем адразу пасля тэрміновай службы.

«Нельга сказаць, што працаваць з ваеннаслужачымі-кантрактнікамі прасцей: ёсць свая спецыфіка, — адзначае намеснік начальніка Супрацьміннага цэнтра Узброеных Сіл па ідэалагічнай рабоце. — У некаторай ступені трывожна. Думаецца, адарваліся ад бацькоўскага ўплыву, атрымаюць першы заробак і чым будуць займацца пасля службы. Спакус у Мінску, як вядома, нямала. Аднак маладыя людзі да нас прыходзяць неспакуслівія. Магчыма, дзейнічаюць матывацыйныя рычагі: парушыў воінскую дысцыпліну — будзеш пазбаўлены прэміі. За сістэматычнае парушэнне салдат пераводзіцца на тэрміновую ваенную службу. Пры гэтым тэрмін, які ён ужо адслужыў, не ўлічваецца — даводзіцца ўсё пачынаць спачатку. Прычым у іншым воінскім падраздзяленні».

Праўда, за чатыры гады існавання Супрацьміннага цэнтра ні аднаго грубага воінскага парушэння не дапушчана. А па-іншаму і не можа быць, бо кожны прыйшоў сюды не пад прымусам, а з вялікім жаданнем служыць, рабіць усё дзеля таго, каб поўнасцю ачысціць беларускую зямлю ад выбуханебяспечных прадметаў.

**Вераніка КАНЮТА.**

---

Праверана на сабе. Жаночы погляд

# НЯБАЧНЫЯ СТРАЛКІ

**Інтэлект, цвёрдая воля, інтуіцыя, вытрымка, халодны розум, роўнае дыханне, поўная канцэнтрацыя і трапны выстрал... Снайперская падрыхтоўка — гэта навука, мастацтва стральбы. Дасканала валодаць зброяй, адчуваць кожную мышцу свайго цела, працаваць з дыханнем, развіваць інтуіцыю — гэта ўсяго толькі некалькі важных пунктаў у падрыхтоўцы снайпераў. Расказваем, якія яны, нябачныя стралкі.**



У беларускай арміі дастаткова выдатных снайпераў, але найлепшыя практыкі, безумоўна, служаць у Сілах спецыяльных аперацый. Каб пазнаёміцца з іх працай, мы прыехалі ў Віцебскую паветрана-дэсантную брыгаду. Разгледзець асобы некаторых са снайпераў не ўдалося нават мне: яны схаваны пад маскамі. І ўсё, што ты бачыш, — вочы. Сканцэнтраваны, сур'ёзны погляд. Але так было толькі першыя паўгадзіны, далей я змагла развесяліць іх і ўбачыць, як усміхаюцца снайперы. Усміхаюцца вачыма.

«Навучыць страляць можна любога, снайперам жа стане не кожны, — заўважае ваеннаслужачы Віцебскай паветрана-дэсантнай брыгады. — Для гэтага неабходныя пэўны склад розуму, схільнасць да складаных матэматычных вылічэнняў і ўседлівасць. Наша работа прадугледжвае працяглае знаходжанне на адным месцы або частае і доўгае перамяшчэнне з цяжкай вагой за плячыма. Снайперу неабходна цярпенне».

Карэспандэнту ўдалося пазнаёміцца з асноўнымі відамі зброі, якой валодаюць гэтыя ваенныя спецыялісты, а таксама апрабаваць іх на справе.

### Вінтоўка «ОСВ-96»: моцная і гучная

Першая на чарзе — буйнакаліберная, аўтаматычная снайперская вінтоўка «ОСВ-96». Яе памеры ўражваюць. Вінтоўка паражае не толькі жывую сілу, але і лёгкабраніраваную тэхніку — на адлегласці да 1,8 кіламетра.

На ўзбраенне зброю прынялі ў 1990 годзе. Набраўшы ў пошукавым радку ў інтэрнэце «ОСВ-96», вам выдадуць дзясяткі фатаграфій байцоў, якія трымаюць вінтоўку ў руках і вядуць з яе агонь. Гэта няпраўда! Страляць з гэтай зброі можна толькі ў становішчы лежачы. Таксама трэба моцна прыціскаць яе да пляча — вельмі моцная аддача. Перад стралянінай мяне палохалі,

Баяздольнасць

# У нагу з часам

## Войскі радыёэлектроннай барацьбы развіваюцца з улікам сусветных трэндаў вядзення баявых дзеянняў

Нягледзячы на тое, што радыёэлектронная барацьба лічыцца даволі маладым кірункам у ваеннай справе, без яе немагчыма ўявіць любы сучасны ўзброены канфлікт. Вопыт цяперашніх войнаў паказвае: сродкі радыёэлектроннай барацьбы здольныя не толькі пазбавіць праціўніка сувязі і ажыццяўлення разведкі, але і ўплываць на работу высокадакладнай зброі. Адукаваныя і тэхнічна падрыхтаваныя спецыялісты РЭБ з лёгкасцю вызначаюць і падаўляюць радыёперашкоду, а таксама ствараюць яе, каб дэзарыентаваць ворага. Невыпадкова іх называюць інтэлектам беларускай арміі. Іншыя клічуць снайперамі эфіру.

Пра тых, для каго эфір — поле бою, а электрамагнітнае выпраменьванне — зброя, расказаў **начальнік штаба — намеснік начальніка ўпраўлення радыёэлектроннай барацьбы Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі палкоўнік Аляксандр НАГАВІЦЫН.** Як развіваюцца войскі РЭБ, якая тэхніка трапляе на ўзбраенне і ці ўлічваецца пры падрыхтоўцы ваеннаслужачых вопыт спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне — у нашай гутарцы.

***— Аляксандр Усевалодавіч, з якімі вынікамі войскі радыёэлектроннай барацьбы завяршаюць год?***

— 2022 — 2023 навучальны год, як заўсёды, для нас быў насычаны на мерапрыемствы і падзеі. У рамках узмацнення Дзяржаўнай граніцы мы працягвалі выконваць задачы па прызначэнні, у тым ліку па прыкрыцці нашых паўднёвых межаў. Акрамя таго, узмоцнена займаліся баявой падрыхтоўкай. Мінулы год ва Узброеных Сілах прайшоў пад назвай баявой мабілізацыйнай гатоўнасці, таму вельмі шмат адпаведных мерапрыемстваў было праведзена. Падводзячы вынік, магу сказаць, што ўзровень нашай баявой мабілізацыйнай гатоўнасці павысіўся. Гэта датычыцца ўсіх воінскіх часцей і органаў кіравання. Акрамя таго, прынялі на ўзбраенне шэраг новых узораў тэхнікі РЭБ, якая ўжо паспяхова эксплуатуецца ў воінскіх часцях і выконвае задачы па прызначэнні. Пашырыліся задачы і магчымасці па вядзенні радыёэлектроннай барацьбы. Сёлета створана група па супрацьдзеянні беспілотным лятальным апаратам. Пастаўляюцца навейшыя ўзоры тэхнікі радыёэлектроннай барацьбы, праводзяцца выпрабаванні, ажыццяўляюцца новыя распрацоўкі. У цэлым, навучальны год быў станоўчым. У рамках баявой і аператыўнай падрыхтоўкі ўсе воінскія часці выканалі задачы на «добра» і «выдатна», паказалі высокі ўзровень баявой падрыхтоўкі, зладжанасці, вывучкі, у тым ліку палявой. Пры гэтым палявая вывучка ў нас у прыярытэце. Як паказвае практыка, без яе нікуды. Хацелася б адзначыць і ролю штабоў, кіруючага саставу ва ўзаемадзеянні з асабовым складам. Правяраючы органы кіравання аператыўных аб'яднанняў, мы пераканаліся ў тым, што афіцэры разумеюць ролю і значнасць радыёэлектроннай барацьбы, эфектыўна прымяняюць падпарадкаваныя ім сілы і сродкі ў шматлікіх умовах абстаноўкі.

***— Чым абумоўлена рашэнне аб стварэнні падраздзялення для барацьбы з беспілотнымі лятальнымі апаратамі?***

— Мы бачым, што ў апошнія гады набірае абароты прымяненне беспілотных лятальных апаратаў. Прычым усюды. Не толькі ў мірным жыцці, а і ў ваенных падзеях, у тым ліку на Украіне. Гэтаму пацвярджэнне — і палесціна-ізраільскі канфлікт. Беспілотнікі выкарыстоўваюцца як сродак вядзення разведкі, мініравання, агнявога паражэння. Для таго каб эфектыўна супрацьдзейнічаць гэтаму, была створана група для барацьбы з беспілотнымі лятальнымі



апаратамі. Мы пастаянна апрацоўваем новыя ўзоры тэхнікі для барацьбы з імі, выпрацоўваем алгарытмы, як правільна выкарыстоўваць гэтую тэхніку, вучым дзейнічаць салдат у баі ва ўмовах прымянення беспілотных лятальных апаратаў.

***— Якія прыярытэты вызначаны на новы навучальны год, які ва Узброеных Сілах ужо пачаўся?***

— Радыёэлектронная барацьба — гэта адносна малады від стратэгічнага аператыўнага і баявога забеспячэння войскаў. Але, як паказвае практыка, з кожным годам важнасць РЭБ становіцца ўсё больш істотнай. Узровень развіцця тэхнікі радыёэлектроннай барацьбы пастаянна павышаецца. Калі мы не будзем крочыць у нагу з часам, не зможам якасна выконваць пастаўленыя задачы. І тут красамоўны прыклад мабільнага тэлефона. Мадэль, якая сучасная і модная сёння, праз год ужо састарыцца, і ў чалавека ўзнікне жаданне набыць сабе новы тэлефон. Тое самае і з тэхнікай РЭБ. Калі ўчора яна была актуальная, то сёння і заўтра яе трэба мадэрнізаваць і паляпшаць. Таму мы пастаянна адсочваем тэндэнцыі: гэта датычыцца як высокадакладнай зброі, сродкаў сувязі, сістэм кіравання, так і ў цэлым формаў і спосабаў вядзення баявых дзеянняў. Асаблівая ўвага па-ранейшаму накіравана на падрыхтоўку асабовага саставу. Усё пачынаецца з кадраў. Калі не будзе падрыхтаванага спецыяліста радыёэлектроннай барацьбы, то ад радыёэлектроннай барацьбе можна нават не казаць. І, нарэшце, навука. Гэта база, якая кладзецца ў сістэму падрыхтоўкі і сістэму развіцця тэхнікі для таго, каб яна эфектыўна прымянялася. Гэта тры кіты развіцця войскаў РЭБ, якія павінны працаваць як адзінае цэлае. Тэхніка — пастаянна развіваецца, людзі — праводзіць падрыхоўку, навука — адсочваць тэндэнцыі, формы і спосабы вядзення сучасных войнаў і даваць рэкамендацыі, у тым ліку пры падрыхтоўцы асабовага складу і пры распрацоўцы новай тэхнікі.

***— Спецыялісты радыёэлектроннай барацьбы на вагу золата. Ці застаюцца яны ў арміі пасля праходжання тэрміновай ваеннай службы?***

— У нашых падраздзяленнях павышаецца працэнт укамплектаванасці кантрактнікамі. Салдат тэрміновай службы становіцца менш, бо вялікая колькасць жадаючых служыць па кантракце. Пастаянна праводзіцца конкурс. Адбіраем толькі найлепшых. Акрамя таго, на працягу апошніх двух гадоў у Ваенную акадэмію на спецыяльнасць «радыёэлектронная барацьба» паступаюць нават дзяўчаты. А сёлета ўпершыню за ўсю гісторыю ў навучальную ўстанову на нашу спецыяльнасць паступіла сямейная пара.

***— Якія навінкі ў апошні час сталі на ўзбраенне войскаў РЭБ?***

— Пры аснашчэнні нашых падраздзяленняў у першую чаргу ўлічваюцца асноўныя тэндэнцыі ў развіцці тэхнікі. Цяпер вельмі актуальна супрацьдзеянне высокадакладнай зброі. Дзякуючы нашым сродкам РЭБ боепрыпасы пераўтвараюцца ў звычайныя снарады, якія ляцяць з вельмі высокай памылкай і не трапляюць у цэль. Пры ўздзеянні сродкаў радыёэлектроннай барацьбы ўхіленне ад цэлі складае сотні метраў, а часам і кіламетры. Так высокадакладныя боепрыпасы, якія каштуюць вялікіх грошай, становяцца балванкамі. Што датычыцца супрацьдзеяння беспілотным лятальным апаратам, зенітна-ракетным комплексам спраўляцца з імі складана і эканамічна затратна. Сродкі РЭБ у барацьбе з беспілотнікамі прыкладаюць мінімум намаганняў, але эфект у выніку істотны. Распрацоўваем тэхніку для супрацьдзеяння беспілотнікам рознага тыпу, у тым ліку FPV-дронам, якія з'яўляюцца галаўным болем ва ўзброеным канфлікце на Украіне. Як паказвае практыка, адзін комплекс РЭБ для барацьбы з FPV-дронамі можа захаваць сотні жыццяў. Іншы кірунак — супрацьдзеянне спадарожнікавым радыёнавігацыйным сістэмам, самалётным радыялакацыйным станцыям, развіццё станцый перашкод у дыяпазонах частот, якім дагэтуль мы не ўдзялялі ўвагі. Радыёэлектронная барацьба развіваецца ў нагу з аб'ектамі радыёэлектроннага паражэння. Калі з'яўляецца пэўны аб'ект радыёэлектроннага падаўлення, то пад яго ствараецца сродак радыёэлектроннай барацьбы. Яны ўзаемазвязаны. Хачу адзначыць, што нашы прадпрыемствы ваенна-прамысловага комплексу эфектыўна праводзяць гэту работу. Роля ВПК у аснашчэнні нашых воінскіх часцей сучаснай тэхнікай высокая. Літаральна нядаўна прыняты на ўзбраенне новыя комплексы для супрацьдзеяння беспілотным лятальным апаратам. На гэтым работа не спыняецца. У наступным годзе чакаем пастаўку яшчэ шэрагу комплексаў.

***— Ці ўлічваеце ў баявой падрыхтоўцы вопыт СВА?***

— Спецыяльная ваенная аперацыя — наглядны прыклад сучасных ваенных дзеянняў. З усімі навінкамі тэхнікі, тактычнымі прыёмамі вядзення ўзброенай барацьбы. І тое, што мы назіраем за гэтым канфліктам збоку, — заслуга нашага кіраўніка дзяржавы. У сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў радыёэлектроннай барацьбы робім акцэнт на тэхніцы РЭБ, якую неабходна распрацоўваць і пастаўляць у войскі ў першую чаргу. Мы бачым, як прымяняецца зброя, як ажыццяўляецца падрыхтоўка асабовага саставу. У цэлым сочым за тэндэнцыямі: аналізуем, што сыходзіць на другі план, што становіцца больш эфектыўным.

***— І, напэўна, прымяняецца новыя веды на практыцы...***

— У ліпені наступнага года запланавана спецыяльнае вучэнне, у межах якога хочам выпрабаваць новыя ўзоры тэхнікі, праверыць узровень падрыхтоўкі асабовага складу, зладжанасць нашых падраздзяленняў. Адпрацуем новыя тактычныя прыёмы, якія мы ўзялі на ўзбраенне, а таксама замацуем тыя навыкі і ўменні, якія ёсць у нашых ваеннаслужачых. Акрамя таго, нашы сілы і сродкі прымуць удзел ва ўсіх мерапрыемствах аператыўнай падрыхтоўкі Узброеных Сіл. У тым ліку ў двухбаковым камандным вучэнні, запланаваным на верасень наступнага года, дзе мы будзем прымаць актыўны ўдзел як у рамках радыёэлектроннага паражэння, так і ў рамках радыёэлектроннай абароны.

**Вераніка КАНЮТА.**

---

што не варта нават спрабаваць: маўляў, яна не для жаночых рук і што ад аддачы можа выбіць плечавы сустаў. Я ж дзяўчына смелая, але, не хаваю, перад стральбой хвалявалася.

Уражанні засталіся дваякія. Спадабалася — гэта дакладна. Але адчуванне, што ты страляеш не са снайперскай вінтоўкі, а з ручнога супрацьтанкавага гранатамёта. Моц гэтай зброі адчуваецца. Суцэльнае захапленне выклікае прыцэл. Адзіны з мінусаў, які я б назвала, — вельмі гучны гук. Невыпадкова з мэтай бяспекі таму, хто страляе, трэба працаваць у навушніках, а для таго, хто знаходзіцца побач, — адысці на бяспечную адлегласць. Што датычыцца моцнай аддачы, слушную параду даў інструктар: падчас стральбы трэба кантраляваць сваё цела — адчуваць шкілет, а не мышцы.

### Вінтоўка «Драгунова»: надзейная і з патэнцыялам

У кожнага ваеннага журналіста ёсць свая мара. Мая — пастраляць са знакамітай снайперскай вінтоўкі Драгунова — нядаўна спраўдзілася. Водгукаў пра вінтоўку шмат. Калі і кажуць пра яе нешта дрэннае, то ў выніку ўсё роўна прызнаюць, што гэта найлепшая снайперская зброя, якую бралі ў рукі. Яна настолькі надзейная, што з ёй не прападзеш. Вінтоўка Драгунова запатрабавана і ў сучасных умовах. Спецыялісты сцвярджаюць, што яе можна яшчэ не раз мадэрнізаваць: у вінтоўку закладзены вялікі патэнцыял.

Інструктар ускладніе мне задачу: змяняе становішча стральбы. Даводзіцца станавіцца на калена. Дарэчы, страляць лежачы значна зручней, чым з калена. Вінтоўка даволі цяжкая — 4,2 кілаграма, плюс магазін. Галоўнае — трэба трымаць баланс, каб прыцэл «не гуляў». Спытала дазвол пастраляць з двух кален, але так, на жаль, нельга, бо стральба будзе неэфектыўная. Такім чынам, страляць з вінтоўкі Драгунова няпроста. Я ніяк не магла «пасябраваць» з прыцэлам. Для гэтага неабходны ні гадзіны і ні дні стральбы, а нашмат больш часу.

### Вінтоўка «МЦ-116»: ціхая і дакладная

Расійскім збройнікам удалося стварыць адну з самых эфектыўных вінтовак у свеце — МЦ-116М. У базавым варыянце яна была распрацавана ў 1997 годзе пад патрон 7,62 міліметра з эфектыўнай далёкасцю стральбы да 800 метраў. Зброя створана на базе МЦ-13 у якасці выключна спартыўнай зброі — менавіта з ёй выступалі айчынныя стралкі на міжнародных спаборніцтвах. У 1988 годзе вінтоўку выпусцілі ў колькасці ўсяго 20 штук для зборнай каманды СССР. Называлася яна тады МЦ-116-1. У 1997 годзе тульскае канструктарскае даследчае бюро мадэрнізавала свой выраб, зрабіўшы яго шматзарадным, і ў 2001 годзе прапанавала сілавікам пад назвай МЦ 116М.

Гэта маё другое знаёмства з вінтоўкай. Я ўжо страляла з яе, ад чаго атрымала каласальнае задавальненне. Ціхая, выдатны прыцэл, плаўны спуск — і стапрацэнтнае пападанне ў цэль.

Ці гатовыя вы днямі быць у адзіноце, выконваючы баявую задачу? Праводзіць суткі пад гарачым сонцам ці гадзінамі адчуваць, як дождж хвошча па целе? А навучыцца стрыманасці? Упэўнена, далёка не кожны здольны прысвяціць сябе гэтай прафесіі, пераадолець усе цяжкасці і дасканала авалодаць зброяй. Як, у прынцыпе, і не кожны зможа надзець ваенную форму і ўстаць у вайсковым шэрагі. Гэта лёс абраных.

**Ганна ЧЫЖ-ЛІТАШ.**

**Фота з архіва аўтара.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Краснодворцы» (продавец)**

проводит повторный открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ ЗЕРНОСКЛАДА С ПОЖАРНЫМ РЕЗЕРВУАРОМ

**с инв. № 644/С-61266, общей площадью 428 кв. м и**

## ЗДАНИЯ ЗЕРНОСКЛАДА

**с инв. № 644/С-61267, общей площадью 701 кв. м, расположенных на земельном участке с кадастровым номером 625082300001000066 площадью 1,2635 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Солигорский район, Краснодворский с/с, 12, 0.3 южнее д. Пруссы.**

Начальная цена с НДС (20%) **– 39 984,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **3 998,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 30 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 05.07.2023, 07.09.2023.

Аукцион состоится **10.01.2024 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.01.2024** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра 8 (029) 140-29-49.**

УНП 600071008

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ОО «АЛА»** (УНП 500034202), объявляет о проведении **09.01.2024 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий Агросервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:**

**Лот № 1: арочный гараж с инв. № 640/С-25466, общей площадью 1601,6 кв. м, адрес: Минская обл., г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 228/7.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 134 400,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **13 440,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 50 %.**

**Лот № 2: административное здание с инв. № 640/С-25455, общей площадью 702 кв. м, адрес: Минская обл., г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 228/4.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 115 920,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **11 592,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 70 %.**

**Лот № 3: бытовое здание с инв. № 640/С-25460, общей площадью 40 кв. м, адрес: Минская обл., г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 228/5.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 7 376,40** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **737,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 55 %.**

**Лот № 4: гараж с бытовкой с инв. № 640/С-25468, общей площадью 463 кв. м, адрес: Минская обл., г. Слуцк, ул. М. Богдановича, 228/6.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 67 500,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **6 750,00** бел. руб. (далее – Объекты).
**Стоимость снижена на 55 %.**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624650100001005688 (право общей долевой аренды) площадью 9,0631 га. Для обслуживания объектов будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.**

Лоты №№ 1-3 обременены договорами аренды по 31.03.2024.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) календарных дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов: www.rlt.by.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 23.06.2023, 11.08.2023, 01.09.2023, 06.10.2023, 31.10.2023, 02.12.2023.

Аукцион состоится **29.01.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.01.2024** до **17.00 в каб. 320** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра: (8044) 545-37-36.**

УНП 600043896

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий Агросервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества:**

**Лот № 1: здание цеха по ремонту полнокомплектной техники с инв. № 640/С-26744, общей площадью 2 159,7 кв. м, адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, Весейский с/с, 9/2, восточнее аг. Весея.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **720 000,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **72 000,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 10 %.**

**Лот № 2: диспетчерский пункт с инв. № 640/С-115416, общей площадью 163,5 кв. м, адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, Весейский с/с, 9/20, восточнее аг. Весея.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 43 956,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **4 395,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 10 %.**

**Лоты №№ 1–2 расположены на земельном участке с кадастровым номером 624681302601000705 площадью 9,0631 га (право постоянного пользования), для обслуживания будет выделена доля в праве на земельный участок.**

**Лот № 3: подъездной путь 500м с инв. № 640/С-115436, общей протяженностью 627,4 м, адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, 63, железнодорожный путь, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 624650100001006033, площадью 18,1201 га (право аренды), для обслуживания будет выделена доля в праве на земельный участок.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) **– 86 292,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **8 629,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 15 %.**

**Лот № 1 обременен договором аренды по 24.10.2025, лот № 2 – по 01.05.2026.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объекты производится в течение 20 (двадцати) календарных дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в следующих размерах: по лоту № 1 – 2 (двух) процентов, по лоту № 2 – 5 (пяти) процентов, по лоту № 3 – 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.11.2023.

Аукцион состоится **12.01.2024** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.01.2024** до **17.00 в каб. 320** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра (8044) 545-37-36.**

УНП 600043896

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: (0212) 24-63-12, (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витебскоблресурсы», 210034, Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, 193А, тел.: (0212) 65-71-98, (0212) 65-71-70.

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 200/С-49507 площадью 116,5 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – административное здание и магазин, назначение – здание многофункциональное.

Кап. строение с инв. № 200/С-49508, площадью 31,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – проходная, назначение – здание неустановленного назначения. Кап. строение с инв. № 200/С-49509, площадью 91,1 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – административное, назначение – здание административно-хозяйственное, составные части и принадлежности: тамбур. Кап.строение с инв. № 200/С-49510 площадью 116,2 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – гараж и бытовка, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта. Кап. строение с инв. № 200/С-49511 площадью 280,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: пристройка. Кап.строение с инв. № 200/С-49512, площадью 2120,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – материальный склад № 1, 4, 6, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: рампа, навес, отдельная рампа, рампа. Кап. строение с инв. № 200/С-49513, площадью 1131,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – склад № 2, 3, 5, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: пристройка, рампа, навес.

Кап. строение с инв. № 200/С-59958 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, протяженность – 389,30 м, наименование – тепловая сеть, назначение – сооружение специализированное энергетики. Кап. строение с инв. № 200/С-106672, площадью 6470,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, благоустройство территории, наименование – благоустройство территории, назначение – сооружение многофункциональное, составные части и принадлежности: проезжая часть, пешеходная часть, ограждение, трое ворот, бетонная площадка, три калитки, подпорная стена. Вышеуказанные объекты находятся на зем. участке с кадастровым № 240100000003000082, площадью 1,3306 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания универсальной оптовой базы (право постоянного пользования). Кап. строение с инв. № 200/С-59954 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, протяженность – 35,8 м, наименование – хозбытовая канализационная сеть, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 200/С-59955 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, протяженность – 426,45 м, наименование – электрическая сеть, назначение – сооружение специализированное энергетики. Кап.строение с инв. № 200/С-59956 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, протяженность – 57,85 м, наименование – водопроводная сеть, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения. Кап. строение с инв. № 200/С-59957 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, протяженность – 70,75 м, наименование – ливневая канализационная сеть, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства.

**Обременение:** договора аренды № 1/2015 от 02.02.2015 сроком по 31.12.2023, № 13-юр/3663 от 20.09.2022 сроком по 12.10.2024, № 15-юр от 11.11.2022 сроком по 13.11.2024, № 18-юр от 18.02.2023 сроком по 13.02.2024, № 20-юр от 10.05.2023 сроком по 21.05.2024, № 22-юр от 26.10.2023 сроком по 07.11.2024.

**Нач. цена: 590 864,25 бел. руб. с учетом НДС.**

**Задаток: 59 086,42 бел. руб.**

**Дата, время и место проведения повторного аукциона: 16.01.2024 в 15.00 по адресу:** г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Срок внесения задатков и окончания приема документов: с 26.12.2023 с 8.30 по 15.01.2024 до 17.30.**

*Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 11.01.2023, 15.04.2023, 06.06.2023, 13.07.2023, 05.08.2023, 13.09.2023.*

Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции – 40901.

**Условия повторного аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, возместить расходы по проведению независимой оценки на р/с, указанный в протоколе аукциона; подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета аукциона согласно представленного Продавцом проекта договора купли-продажи после согласования сделки и договора купли-продажи с ОАО «Белресурсы» – управляющей компанией холдинга «Белресурсы», но не позднее 30 (тридцати) рабочих дней со дня проведения аукциона; оплатить предмет аукциона в течение 30 календарных дней после заключения договора купли-продажи; оплата расходов по гос. регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на недвижимое имущество осуществляется за счет Покупателя. С проектом договора можно ознакомиться у Организатора торгов по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, каб. 4.

Условия договора купли-продажи могут быть изменены с учетом замечаний ОАО «Белресурсы» – управляющая компания холдинга «Белресурсы» в ходе согласования сделки и договора купли-продажи.

*Расходы Продавца по проведению независимой оценки составляют 3619,44 бел. руб. с учетом НДС.*

**Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона.

Доп. информацию по торгам можно получить по тел.: **(0212) 24-63-12, (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: **+375 (33) 3078303** Ковалева Евгения Александровна, **+375 25 5150243** Кадушкевич Виктория Александровна.

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

### 26 января 2024 г. по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Каменка, Новодворье, посёлке Усяж

***Организатор аукциона: Усяжский сельский исполнительный комитет, 222212, пос. Усяж, ул. Комсомольская, д. 10.***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь, (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | дер. Каменка, ул. Дачная (объект № 12/2021) | 624885603101000207 | 0,1121 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 20 000,00 |
| 2 | дер. Новодворье. ул. Центральная (объект № 99/2021) | 624885605101000122 | 0,15 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 15 000,00 |
| 3 | пос. Усяж | 624885606601000057 | 0,1499 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 15 000,00 |

Аукцион состоится **26 января 2024 г. в 15.00** в Усяжском сельском исполнительном комитете по адресу: ***пос. Усяж, ул. Комсомольская, д. 10***, кабинет председателя.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/,** Смолевичского райисполкома – **isp@smolevichi.gov.by,** на сайте Минского областного исполнительного комитета.

УНП 600023836

# АДЗІНЫ ЧАЛАВЕЧЫ ЛЁС: КІТАЙСКІ СЦЭНАРЫЙ

## Чытайце па-беларуску працы Сі Цзіньпіна

**Кітайска-беларускі сімпозіум, прысвечаны тэме дзяржаўнага кіравання, адбыўся ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі следам за прэзентацыяй кнігі старшыні КНР Сі Цзіньпіна «Аб дзяржаўным кіраванні», якая намаганнямі беларускай «Мастацкай літаратуры» і кітайскага Выдавецтва літаратуры на замежных мовах пабачыла свет у перакладзе на беларускую мову. Дарэчы, на самым пачатку размовы пра навукова-практычную імпрэзу хацелася б зазначыць, што перакладчыцкую працу ажыццявіў беларускі паэт, перакладчык, мовазнавец Дзмітрый Пятровіч, які, на вялікі жаль, не так даўно пайшоў з жыцця ад ковіда, а рэцэнзентамі беларускага выдання выступілі вядомыя беларускі культуролаг, філосаф, спецыяліст у галіне беларуска-кітайскіх стасункаў Барыс Святлоў і кітайскі спецыяліст Лі Мэньэ.**



Фота БелТА.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Спікеры сімпозіума.

Колькі слоў з гісторыі пытання. Працы Сі Цзіньпіна «Аб дзяржаўным кіраванні» ўжо былі надрукаваны ў верасні 2014 года на кітайскай, англійскай, французскай, рускай, арабскай, партугальскай, нямецкай, японскай і іншых мовах. Выданне атрымала самае шырокае распаўсюджванне не толькі, зразумела, у Кітаі, але і па ўсім свеце. Выданне гэтых прац, як гаворыцца ў прадмове да першага тома «Аб дзяржаўным кіраванні» (напісана гэтае ўступнае слова ў студзені 2018 года, а цытуем мы яго па беларускім выданні першага тома) «...адыграла важную ролю для вывучэння ідэй сацыялізму з кітайскай спецыфікай новай эпохі сярод кадравых работнікаў і насельніцтва Кітая, прадставіла важныя дакументы, якія знаёмяць міжнародную супольнасць з сучасным становішчам у нашай краіне і ў Кампартыі Кітая. Пасля XIX з'езда КПК у лістападзе 2017 года быў выдадзены другі том прац Сі Цзіньпіна «Аб дзяржаўным кіраванні», каб дапамагчы кітайскім і замежным чытачам сістэматызавана азнаёміцца з насычаным зместам ідэі Сі Цзіньпіна аб сацыялізме з кітайскай спецыфікай новай эпохі, скласці ўяўленне аб яе духоўнай сутнасці». І яшчэ — з уступнага слова: «... У гэтых працах прадстаўлены распрацаваны КПК кітайскі сцэнарый стварэння супольніцтва адзінага чалавечага лёсу, увасоблена мудрасць кітайскага народа, якая павінна стаць укладам у высакародную справу міру і развіцця чалавецтва».

З дакладамі на сімпозіуме перад акадэмічнай, навуковай і творчай грамадскасцю краіны выступіла вялікая каманда людзей, даследчыкаў, якія прычыніліся не толькі да выдання першага беларускага тома «Аб дзяржаўным кіраванні», але і імкнуцца ўплываць на агульны стан спраў у развіцці беларуска-кітайскіх выдавецкіх і літаратурных стасункаў у апошнія дзесяцігоддзе. Уступным словам адкрыў семінар **дырэктар аддзела міжнароднага супрацоўніцтва Упраўлення КНР па справах выдання і распаўсюджвання літаратуры на замежных мовах Лю ШУАНЬЯН.** Далей выступіў **дырэктар Кітайскага выдавецтва літаратуры на замежных мовах Ху КАЙМІНЬ,** следам — **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ,** затым — **дырэктар комплекснага дзелавога аддзела Упраўлення КНР па справах выдання і распаўсюджвання літаратуры на замежных мовах Сінь ФЭН, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» вядомы ў Беларусі паэт і празаік, член прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь БАДАК, генеральны дырэктар фінансавага аддзела ААТ «Кітайская карпарацыя інжырынгу САМС», намеснік генеральнага дырэктара СЗАТ «Кампанія па развіцці Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка» Вэй ЦЗЯНЬХУА, дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, член прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі Іван САВЕРЧАНКА.**

Кіраўнік кітайскага выдавецтва Ху Каймінь распавёў даволі падрабязна пра асноўныя прыярытэты, якімі кіравалася і кіруецца іх выдавецкая ўстанова (яна, дарэчы, выпускае некалькі тысяч назваў кніг у год літаральна на дзясятках моў народаў свету) пры выданні твораў лідара КНР. Асноўны клопат складае жаданне зрабіць яго думкі і меркаванні пра ўладкаванне ва ўсіх сферах жыцця ў Кітаі і памкненнях мірнага кітайскага народа да добрасуседства з блізкімі і далёкімі краінамі даступнымі іншым народам на іх родных мовах. «Будучы вышэйшым кіраўніком КПК і КНР, Сі Цзіньпін неаднойчы закранаў у сваіх выступленнях пытанні кіравання дзяржавай. Ён вылучыў шмат новых ідэй, поглядаў і вывадаў, даў паглыбленыя тлумачэнні па шэрагу найважнейшых тэарэтычных і практычных пытанняў, якія датычацца развіцця партыі і дзяржавы ў новых гістарычных умовах, коратка акрэсліў канцэпцыю кіравання дзяржавай і палітычны курс, якіх прытрымліваецца новы кіруючы калектыў ЦК партыі. Адгукаючыся на шырокі інтарэс міжнароднага супольніцтва і маючы на мэце садзейнічанне яму ў паглыбленым разуменні канцэпцыі развіцця Кітая, яго шляхаў развіцця, а таксама ўнутранай і знешняй палітыкі...»

У сваім грунтоўным выступленні на сімпозіуме дырэктар «Мастацкай літаратуры» Алесь Бадак звярнуў увагу на вопыт падначаленай яму выдавецкай структуры ў выданні ўвогуле кітайскай літаратуры на беларускай і рускай мовах. «... У 2018 годзе ў час міжнароднай кніжнай выстаўкі ў Пекіне паміж выдавецтвам «Мастацкая літаратура» і Пекінскім Выдавецтвам па выкладанні і даследаванні замежных моў падпісана пагадненне аб выданні серыі кніг пад агульнай назвай «Ключавыя канцэпты кітайскай думкі і культуры» ў перакладзе на беларускую мову. З 2018 па 2021 гады выйшла сем кніг гэтай серыі. І вось цяпер мы рэалізуем чарговы сумесны кніжны праект: пераклад на беларускую мову і выданне кнігі Сі Цзіньпіна «Аб дзяржаўным кіраванні». На першы погляд можа падацца, што тэма дзяржаўнага кіравання не ўваходзіць у лік прыярытэтных тэм нашага выдавецтва. Але гэта, вядома ж, не так. Сёння ўвага ўсяго свету прыкавана да Кітайскай Народнай Рэспублікі. Яе шлях развіцця, яе ідэйныя асновы ўнутранай і знешняй палітыкі выклікаюць зацікаўленасць далёка не толькі ў спецыялістаў-кітаязнаўцаў. Гэта шлях развіцця, падтрыманы ўсімі складнікамі кітайскага грамадства, шмат гаворыць пра сам народ, яго менталітэт, яго традыцыі і духоўныя памкненні. А гэта ёсць першасны аб'ект даследавання літаратуры. Тым болей калі размова ідзе пра міжнароднае літаратурнае ўзаемадзеянне і ўзаемаразуменне». Алесь Мікалаевіч адзначыў, што ў першым томе Сі Цзіньпіна «Аб дзяржаўным кіраванні»ўвялікае месца надаецца пытанням культуры як аб'екта нацыянальнага дасягнення і сродка выхавання, што, канешне ж, заўсёды было і застаецца ў полі зроку і беларускага выдавецтва мастацкай літаратуры. Беларускі літаратар нагадаў, што Сі Цзіньпін акрэсліў і наступнае перакананне: у адносінах да традыцыйнай культуры краіны і да культуры іншых краін варта прытрымлівацца такога прынцыпу — паставіць старажытнасць на службу сучаснасці, паставіць замежнае на службу нашай краіне, атрымаць, узвысіць сапраўднае, адкінуўшы ўбок падманлівае. Старшыня КНР лічыць — і з гэтым нельга не пагадзіцца, — што, абапіраючыся на канцэпцыі каштоўнасцяў і маральна-этычныя нормы, якія завяшчалі нам прашчуры, «мы павінны прытрымлівацца прынцыпу — выкарыстоўваць іх ва ўмовах сучаснасці, прыладжваць іх да нашай эпохі, наследаваць, узнаўляць і развіваць з улікам таго, каб усе культурныя багацці нацыі былі скіраваны на асвету і выхаванне народа».

На прыхільнасць Сі Цзіньпіна да захавання старажытнага, традыцыйнага, яго памкненне паставіць гістарычны і шматвекавы кітайскі вопыт на службу сучаснасці звярнуў увагу ў сваім выступленні і дырэктар Інстытута літаратуразнаўства доктар філалагічных навук Іван Саверчанка. Вучоны і кіраўнік аўтарытэтнага даследчыцкага цэнтра беларускай літаратуры расказаў пра тое, што робіцца ў нашым беларускім інстытуце, увогуле ў нашай краіне ў гэтым кірунку. У прыватнасці, за апошнія гады выдадзены поўныя зборы твораў класікаў нацыянальнай літаратуры — народнага песняра Беларусі Якуба Коласа, народнага паэта Беларусі Максіма Танка (дарэчы, творы Коласа і Танка не аднойчы выходзілі асобнымі кнігамі і ў Кітаі), завяршаецца Збор твораў народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля, выйшаў Збор твораў народнага пісьменніка Беларусі Івана Навуменкі. Паспяхова выдаецца «Залатая калекцыя беларускай літаратуры» ў 50-ці тамах. Пабачылі свет 25 тамоў, у якіх надрукаваны шэдэўры нацыянальнай класічнай паэзіі і прозы. Актыўна развіваецца гістарычная проза, відавочны росквіт дзіцячай літаратуры і дзіцячага кнігавыдання. «Вучонымі-лінгвістамі краіны, — заўважыў Іван Васільевіч, — падрыхтаваны ўнікальны «Беларуска-кітайскі і кітайска-беларускі слоўнік». Ён дапаможа беларусам і кітайцам наладжваць стасункі, а таксама спасцігаць старажытную кітайскую мудрасць і чытаць працы сучасных аўтараў у арыгінале...»

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч падрабязна распавёў пра развіццё беларуска-кітайскіх літаратурных і кнігавыдавецкіх сувязяў і з беларускага, і з кітайскага бакоў менавіта ў апошняе дзесяцігоддзе. Алесь Мікалаевіч адзначыў, што высокі плён, выданне каля дваццаці кніг кітайскіх класікаў і сучасных пісьменнікаў у перакладзе на беларускую мову было б немагчымым без супольнай працы выдаўцоў, кітаістаў з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта — найперш з факультэта міжнародных адносін і філалагічнага факультэта. Менавіта падрыхтаваныя ў Беларусі маладыя перакладчыкі ў добрым сэнсе слова справакавалі росквіт, новы этап у перакладзе кітайскай паэзіі на беларускую мову з арыгіналаў мастацкіх твораў. Шмат дапамаглі ў гэтых клопатах і стасункі з кітайскімі даследчыкамі, літаратуразнаўцамі, перакладчыкамі. Выдавецкі дом «Звязда»па-сапраўднаму пасябраваў з класікам кітайскага мастацкага перакалада Гаа Манам, доктарам філалагічных навук Чжан Хуэйцінь, літаратуразнаўцам Ся Чжунсянь, дэканам філалагічнага факультэта Другога Пекінскага ўніверсітэта замежных моў Хань Сяае, перакладчыкам беларускай паэзіі на кітайскую мову прафесарам Гу Юем... Зробленае гэтымі асобамі, іх прыязнасць да Беларусі, да беларускай літаратуры і культуры аказалі і працягваюць аказваць значны ўплыў на развіццё беларуска-кітайскіх гуманітарных і культурных, літаратурных стасункаў, на пашырэнне прасторы ведання пра Беларусь у Кітаі.

...У дачыненні да краін Азіі яшчэ дзесяць гадоў назад Сі Цзіньпін выказаў такую думку: «У чалавецтва толькі адна планета, адзін свет, у якім існуе мноства краін. Агульнае развіццё з'яўляецца важнай асновай устойлівага развіцця, адпавядае доўгатэрміновым карэнным інтарэсам усіх народаў. Мы жывём у адной глабальнай вёсцы, аб'яднаныя агульным лёсам; мы павінны ісці ў нагу з часам, прытрымлівацца правільнага курса, праяўляць салідарнасць, каб вывесці развіццё Азіі і ўсяго свету на новы ўзровень...» Гэтыя словы з'яўляюцца актуальнымі для ўсяго свету. Пра агульнасць лёсаў, пра тое, што ў нас адна планета, адзін свет, не аднойчы гаварыў добры сябар Сі Цзіньпіна — Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка. Яго стасункі, яго сяброўства з Сі Цзіньпінам, яго даўняе разуменне маштабаў кітайскага будаўніцтва ў свеце і трывалы грунт для новых, для будучых супольных прац з Кітаем. А на сімпозіуме гаварылася і пра працяг выдання, пра новыя тамы «Аб дзяржаўным кіраванні». Паранейшаму ажыццяўленне гэтага праекта — за выдавецтвам «Мастацкая літаратура», за Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Дар'я ГАРАЖАНКА:

# «Я НЕ Ў ПОЎНАЙ МЕРЫ ЎЯЎЛЯЛА, ШТО ТАКОЕ «ВЯЛІКАЯ ОПЕРА»

**Яе імя стала шырока гучаць у музычных колах за межамі Беларусі ў сувязі з удзелам у тэлевізійным праекце «Вялікая опера». Але гледачы Вялікага тэатра Беларусі знаходзяцца ў больш выгадным становішчы: могуць слухаць меццасапрана Дар'і ў шэрагу спектакляў, а таксама ў канцэртах — маладая салістка звярнула на сябе ўвагу і цяпер даволі запатрабавана. У яе ўжо ёсць калекцыя вобразаў у тэатры — і гэта менавіта той варыянт вялікай оперы, якая варта ўсяго жыцця...**



***— Калі дзяўчынка разумее, што ў яе ёсць голас, яна, відаць, марыць стаць зоркай. І мала хто, напэўна, марыць аб оперным тэатры...***

— Я нават не марыла, а проста ведала, што не магу не спяваць. У самым раннім дзяцінстве думала, што буду эстраднай спявачкай. Але маці ў нейкі момант сказала, што трэба быць добрым музыкам, атрымаць спецыяльную адукацыю і паступаць у музычнае вучылішча. А калі пачала вучыцца, мяне гэта ўсё зацягнула. Мой педагог Вольга Аляксандраўна Косарава дала столькі ведаў і навыкаў, што з разумела: мяне гэта цікавіць больш, чым эстрада. Потым пераканалася, што мне бліжэй тэатральная сцэна, бо спектаклі даюцца нават лягчэй, чым сольныя выступленні.

***— Ваша мама мае дачыненне да музыкі?***

— Яна іграла на фартэпіяна, але з-за аварыі яе музычная кар'ера не склалася. Але яна скончыла інстытут культуры (харавое дырыжыраванне) і была музычным работнікам — спачатку ў дзіцячым садку, потым працавала ў школе настаўнікам музыкі, потым завучам па эстэтычным выхаванні, выкладала сусветную мастацкую культуру. Яна музычны і творчы чалавек. Ходзіць на спектаклі і выказвае мне свае заўвагі — адчувае інтуітыўна, што ўдалося, а што не вельмі, на яе погляд. Тата таксама можа выказаць сваё меркаванне, але ён не звязаны з музыкай увогуле. Я на працягу ўсёй сваёй вучобы назірала за яго музычнай эвалюцыяй ад «нічога не зразумеў» да жадання выказаць сваё аргументаванае меркаванне. Опера — складаны жанр, які патрабуе часу і жадання прымушаць свой мозг напружвацца. Чым больш слухаеш — тым лепш фарміруецца разуменне. Яшчэ я лічу, што абавязкова трэба слухаць добрых спевакоў.

***— А калі вы адчулі, што ваша месца на опернай сцэне?***

— Калі я вучылася ў Маскоўскай кансерваторыі, то нейкія партыі ўжо спявала ў опернай студыі. І калі прыйшла ў Вялікі тэатр Беларусі, то ў мяне ўжо былі гатовыя партыі, напрыклад, Вольга ў «Яўгеніі Анегіне», Флора ў «Травіяце», Лаура ў «Іаланце». Гэтыя тры партыі я выконвала на сцэне Вялікай залы кансерваторыі ў Маскве. Рыхтавала тады і Любашу на дзяржэкзамен, але здарыўся ковід і па-іншаму склаліся абставіны, таму не так даўно ў мяне адбылася прэм'ера ў «Царскай нявесце». У тэатр я прыйшла ўжо з багажом — партыямі, якія спявала раней. А цяпер у мяне іх каля 10. Іду ад малога да вялікага, паступова паглыбляюся ў працу і развіваюся.

***— У вас вельмі розныя вобразы. Якія гераіні вам бліжэй?***

— На мой погляд, жаночая натура настолькі шматгранная, што кожны вобраз у той ці іншай ступені адгукаецца ўва мне. У кожнай з нас ёсць крыху Тацціяны, і трошкі Вольгі, і ракавой жанчыны Кармэн, і зладзейкі Любашы, і халоднай Снежнай Каралевы... Таму больш за ўсё мне падабаецца займацца пошукам фарбаў і ў голасе, і ў характары. Нешта мне даецца больш складана. Напрыклад, рыхтавала партыю Снежнай Каралевы. У мяне дастаткова цёплы тэмбр, мяккі, агрэсіўнасць майму голасу не ўласцівая. Але так ці інакш я ўмею злавацца, і трэба гэта ў сабе знайсці і вынесці на сцэну, каб гэта адчулі гледачы. Гэты пошук мяне вельмі захапляе.

Даводзіцца працаваць над сабой, бо не бывае двух аднолькавых спектакляў. І кожны раз я ў сабе адкрываю нешта новае. Напрыклад, у партыі Снежнай Каралевы зразумела, што да асаблівасцяў майго музычнага выканання можна падключыць ідэю, што гераіня не з самага пачатку халодная, а гіпнатызуе і прыцягвае Кая, таму ён ідзе за ёй. Гэта можа быць такая хітрасць, каб апраўдаць мой цёплы тэмбр. Кожная роля — нагода падумаць пра адпаведнасць выканання характару героя.

***— Вы цяпер пагаджаецеся спяваць усё, што прапануюць?***

— Як маладая артыстка я не адмаўляюся ні ад чаго. Мне вельмі цікава паспрабаваць усё. Было што спрабавала пазмагацца з партыяй Разіны. Але зразумела, што альбо я спяваю рэпертуар тыпу Канчакоўны, альбо спяваю рухомы высокі рэпертуар. Таму што быць усёеднай немагчыма, інакш доўга не праспяваеш. У выніку я засталася на тым, што бліжэй маёй прыродзе, што даецца лягчэй. Каларатуры і лішняй вялікай рухомасці ў маім голасе няма, але я гэта развіваю. Ад кожнай партыі бяру нешта, вакальна расту і знаходжу новыя фарбы і ўдасканальваю тэхнічныя моманты.

***— Раіцеся з педагогамі?***

— Я падтрымліваю сувязь з Касрашвілі Маквалай Філімонаўнай, якая была маім выкладчыкам у Маскоўскай кансерваторыі. І з Вольгай Аляксандраўнай тут займаюся. Яна прыходзіць на ўсе спектаклі і прэм'еры, мы абмяркоўваем, вядзём работу над памылкамі. Канешне, каб доўга і добра спяваць, заўсёды павінна быць вуха, якое цябе кантралюе збоку. Мы з маім педагогам супадаем. Ва ўяўленні пра эталоннае гучанне важна мець такога педагога і канцэртмайстра — у гэтым вельмі дапамагае Настасся Дубоўская. Мы з ёй аднолькава глядзім на музыку, і яна ўмее сказаць так, каб я зразумела. Каб адчула, дзе і як павінен нарадзіцца гук, які неабходны.

***— Для вас больш важна праспяваць партыю тэхнічна бездакорна ці ўпісацца ў вобраз спектакля?***

— Рэжысёры даюць сваё бачанне, але я, напэўна, унутрана сама дадаю, што адчуваю. Нават калі ў нас розныя склады, напрыклад, на адной ролі два ці тры выканаўцы, цудоўна менавіта тое, што мы ўсе розныя, творчыя індывідуальнасці. Глядач можа схадзіць на тры розныя склады і атрымаць розныя адчуванні ад аднаго і таго ж спектакля. Ёсць над чым падумаць, бо кожны саліст дадае нешта сваё ў развіццё, у вобразы і думкі, закладзеныя ў твор.

Тэхнічную работу я ўсё ж раблю ў класе і стараюся спяваць так, каб выходзячы на сцэну пра гэта не думаць. Вобраз адкрываецца, калі ты ў яго паглыбляешся, і дае фарбы той самай тэхніцы — адно без другога існаваць не можа. Я імкнуся да таго, каб быў добры сінтэз. Але часам бывае, што эмоцыі захлёстваюць. Трэба ўмець трымаць сябе ў руках, глядзець на дырыжора і кантраляваць, што ты спяваеш, думаць, што павінна быць далей, дзе партнёры, якая мізансцэна... Вельмі шмат задач адначасова.

***— Партнёраў шмат, і калектыў у тэатры вялікі, трэба ў яго ўпісвацца. Як прымаюць маладых артыстаў?***

— Вельмі ўдзячная сваім калегам за мікраклімат і атмасферу ў тэатры, адчуваю сябе цалкам камфортна. Ёсць асаблівасць работы ў тэатры. У нейкіх няпростых рабочых момантах трэба быць эмацыянальна ўстойлівай. Думка, што я прыйшла працаваць у Вялікі тэатр, шмат што ў душы расстаўляе па месцах. Але бывае і роўна наадварот, часам кажу сабе: ты ведала, куды ідзеш. Бо ўсе людзі розныя, а ўсе артысты яшчэ і вельмі эмацыянальныя. І ў гэтым харастве, бо ў кожнага свой шлях у прафесіі.

***— Вы абралі шлях, каб быць у тэатры, але спяваеце канцэрты. Што працэй вытрымаць: спектакль ці канцэрт?***

— Напэўна, мне маральна працэй вытрымаць спектакль. Я адключаюся і гледачоў не бачу, не думаю пра іх. Паглыбляюся ў тыя абставіны, якія абумоўлены дзеяннем, але звяраюся з дырыжорам, паглядаю на яго. Думаю пра вобраз, пра ролю і пра спевы. Калі выходжу ў канцэрце, то, канешне, таксама спрабую падстроіцца, але мне гэта даецца больш складана: я на сцэне адна, усе глядзяць на мяне, я магу бачыць іх вочы...

***— Як вырашаеце, што выконваць у канцэртах?***

— Ёсць тое, што я магу і хачу выконваць, але не адмаўляюся спяваць тое, з чым запрашаюць, калі гэтая музыка ў мяне ў рэпертуары. У мяне ёсць вывучаная праграма, якую мне вельмі хацелася б выконваць. Але яна можа не ўпісвацца ў канцэпцыю рэжысёра. Ці гэта занадта складаная музыка для ўспрымання простага слухача, калі гаворка, напрыклад, аб выязных канцэртах. Але лічу, што часам трэба ісці на рызыку: людзі гэтага ніколі не чулі, яны могуць для сябе адкрыць нешта новае ў музыцы. Трэба ж гледача развіваць, а не даваць яму толькі папсу. Нас часам можа зачапіць дзіўная мелодыя, і ты для сябе адкрываеш тое, што раней ніколі не чуў: а што гэта гучыць? а хто напісаў? які персанаж?.. Пачынаеш шукаць, чытаць, больш даведвацца. Так яно працуе ва ўсіх. Бо бывае, што часам нейкі нумар падчас канцэрта стрэльць зусім нечакана.

***— Ці дапамог вам нешта адкрыць удзел у праекце «Вялікая опера»?***

— Гэта тэлебачанне, тэлепраект, які пабудаваны па канонах шоу. Я да гэтага была гатовая, але, мабыць, не ў поўнай меры ўяўляла, што такое «Вялікая опера». Яшчэ больш упэўнілася: тое, чым займаюся, вельмі суб'ектыўнае мастацтва. Гэта не спорт, у якім ёсць адзін пераможца. Як аднаму чалавеку могуць падабацца ў артысце нейкія якасці, так роўна гэтыя ж якасці іншаму не спадабаюцца. Таму для сябе вырашыла, што да гэтага трэба ставіцца па-філасофску, бо ўсім не спадабаешся.

Шоу пабудавана на тым, што ёсць канкрэтная праграма: італьянская опера, руская, дуэт, аперэта, арыі з опер Вердзі, рамансы Рахманінава, неапалітанская песня і прысвячэнне вялікім спевакам. Няма такіх універсальных артыстаў, якія маглі б быць добрыя ва ўсім. Але гэта цікава. Гэта новы досвед, праверка на трываласць — маральную і фізічную. Здаецца, мне цяпер не страшна наогул нічога.

***— Вы згадалі аб праграме, прысвечанай вялікім спевакам. Каго выбралі?***

— Для мяне абсалютным эталонам меццa-сапрана з'яўляецца Алена Васільеўна Абразцова. І па чалавечых адчуваннях для мяне яна ўвасабленне ідэалу.

***— Звычайна ўсе думаюць, што оперны артыст — гэта перш за ўсё голас...***

— На мой погляд, вельмі важна заўсёды заставацца чалавекам. Трэба быць добрым, але і моцным, каб выжыць. Умець не даваць сябе крыўдзіць, пры гэтым не пакрыўдзіўшы іншых.

***— Напэўна, на «Вялікай оперы» ў вас з'явіліся новыя знаёмыя, і гэта можа быць карысна для далейшай працы ці супрацоўніцтва...***

— Мне вельмі хацелася б, і было б цікава, але пакуль прапаноў не было. Для мяне вынік у тым, што я гэта перажыла. А далей не загадваю. Думаю, што трэба сапраўды рабіць сваю справу, а вынікі ў любым выпадку цябе знойдуць. Можа быць, не ў такой кароткатэрміновай перспектыве.

***— З якім адчуваннем пасля праекта вярталіся ў тэатр?***

— Мне было вельмі цяжка вяртацца. Я прыехала, і якраз пачаўся сезон. Усе пыталі: як? А я нічога не магла расказаць раней часу. Цяжка перажывала, цяпер ужо нейкія заўвагі здаюцца не зусім справядлівымі. І законы жанру дыктуюць умовы: нехта павінен выбываць кожны выпуск. Мы былі ў няпростых умовах, калі ад чакання здымкаў выгараюць нервы. Але тэлеглядач, на жаль, успрымае такога роду шоу і меркаванне журы ісцінай у апошняй інстанцыі. Таму што тэлепраект — гэта тут і цяпер. А потым будзе новы сезон і новыя героі.

У тэатры, наадварот, кожны можа сфарміраваць сваё меркаванне аб артысце. Гледачы могуць звярнуць увагу на маладога выканаўцу, зацікаўленыя гледачы адзначаць дынаміку, з разуменнем таго, што творчае жыццё — не на адзін сезон, што гэта лёс, які патрабуе ад артыстаў пастаяннай работы над сабой. Яны ацэняць, калі ты быў пераканаўчы, гэта заўсёды адчуваецца на паклонах. Часам пастаянныя гледачы дораць мне кветкі.

***— Гледачы бываюць з розным узроўнем падрыхтоўкі. Якая публіка для вас больш зручная? Ці ходзяць не оперныя сябры на вашы спектаклі?***

— Цікава спяваць для больш дасведчаных слухачоў. Ты стараешся як на іспыце, але ў гэтым і складанасць. Іншыя гледачы прабачаць нейкія агрэхі. Але ў гэтым як плюс, так і мінус. Хацелася б расці прафесійна, не даючы сабе ніякіх паслабленняў.

Так, сябры прыходзяць паслухаць. Атрымліваецца, што людзі, якія не звязаныя з музыкай, упершыню ў жыцці прыйшлі ў Вялікі тэатр толькі таму, што я тут працую. Для мяне гэта перамога: прывяла сюды гледача і адкрыла яму гэты жанр. Але аднойчы мне сказалі, што не разумеюць, чаму я гэтым займаюся: опера адбірае ўвесь час, для сябе яго не застаецца. Кажу: ёсць панядзелак, каб прывесці сябе ў парадак... Нездарма гавораць, што ў тэатры служаць. Або ты аддаешся яму цалкам, або не трэба напружвацца. І людзі, якія побач, павінны гэта разумець.

Вядома, на адным энтузіязме доўга не працягнеш, моладзь павінна быць зацікаўлена тут працаваць, бачыць перспектывы для жыцця свайго і сям'і, у каго яна ёсць. Пакуль у мяне нікога няма, я жыву ў тэатры. Рада, што мяне запрашаюць у значныя мерапрыемствы: згаджаюся на ўсё, хоць мяне некаторыя за гэта крытыкуюць. Але мне хочацца і на адпачынак зарабіць, і на рамонт у кватэры, дзе мы жывём з бацькамі. Гляджу на ўсё пазітыўна. Удзячная за магчымасць паказаць сябе і за тое, што мае намаганні не застаюцца незаўважанымі як на ўзроўні кіраўніцтва тэатра, так і на ўзроўні краіны. Таму што шмат залежыць менавіта ад мяне.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ВЫХОЎВАЦЬ СВАЙГО ЧЫТАЧА

## Беларускія кнігі сталі запатрабаванымі

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася прэс-прэзентацыя «Гуманістычны і стваральны патэнцыял беларускай літаратуры», падчас якой ішла гаворка пра самыя значныя кніжныя праекты года. Выданні, якія згадваліся падчас прэс-прэзентацыі, можна было ўбачыць тут жа, на стэндах адмысловай выстаўкі, многія з тых кніг пабачылі свет у Выдавецкім доме «Звязда».**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

— У Год міру і стваральнай працы мы вырашылі зрабіць свята творчага ўраджаю, — гэтымі словамі распачаў імпрэзу дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар Іван Саверчанка, які заўважыў, што літаратура і літаратуразнаўства — два крылы агульнай ідэалагічнай справы.

— Адзін з найбуйнейшых праектаў, пра які мы яшчэ публічна шырока не гаварылі — «Залатая калекцыя беларускай літаратуры ў 50 тт.», серыя, якую мы робім сумесна з выдавецтвам «Мастацкая літаратура». Выдалі ўжо дваццаць пяць тамоў, дваццаць шосты, які прадставіць творчасць Васіля Быкава, знаходзіцца ў друкарні. У гэтай серыі — шэдэўры нацыянальнай літаратуры, ад старажытнасці да сучасных аўтараў. Геніяльныя класічныя творы не менш, а часам і больш актуальныя, чым некаторыя, напісаныя сёння. Класіка застаецца тым фундаментам, на якім вырастае сучасная літаратура. І калі літаратар-эксперыментатар адыходзіць ад класічных традыцый, не маючы ўласнага ўнутранага стрыжня, верагоднасць таго, што яго чакае адмоўны вынік, надзвычай высокая. Таму неабходныя такія буйныя праекты, як «Залатая калекцыя» — яна прадстаўляе нашу дзяржаву, паказвае, што ў нас ёсць вялікая плынь нацыянальнай літаратуры, ёсць сувязь пакаленняў.

Найлепшы помнік для пісьменніка, ушанаванне яго памяці — гэта выданне яго збору твораў. Дасягненнем акадэмічнага літаратуразнаўства можна лічыць падрыхтоўку акадэмічных збораў твораў класікаў нацыянальнай літаратуры — Максіма Танка, Янкі Брыля і Кузьмы Чорнага. Яшчэ адзін кніжны праект, варты ўвагі, — «Сучасная літаратура краін СНД», які ажыццяўляецца міжнародным калектывам навукоўцаў, пісьменнікаў і перакладчыкаў. Таксама Іван Саверчанка згадаў сярод значных кніжных вынікаў года аўтабіяграфічны раман ганаровага старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая Чаргінца «Цяжкія дарогі жыцця: трывожныя дні», які пабачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда».

— Яшчэ нядаўна часта можна было пачуць пытанне — «А ці ёсць цікавасць да беларускай літаратуры? Ці ёсць цікавыя беларускія пісьменнікі?» Выдавецтва «Мастацкая літаратура» адказвае на гэта сваімі кніжкамі, — гаворыць дырэктар выдавецтва Алесь Бадак. — Некалькі гадоў таму мы пачалі праект «Народная бібліятэка». Звярталіся да чытачоў розных узростаў з пытаннем: якія творы класікаў яны лічаць сваімі ўлюбёнымі? І па выніках адказаў складалі кніжкі. Гэта ўнікальны выпадак, калі ў зборніка няма ўкладальніка, бо ўкладальнік — народ. Кнігі гэтага праекта вельмі хутка разыходзяцца, і не толькі такіх аўтараў як Максім Багдановіч, Янка Купала, Якуб Колас. Сёлета мы выдалі том твораў Вячаслава Адамчыка — і яго ўжо няма ў продажы. Зараз выходзіць том Івана Чыгрынава — мы ўпэўненыя, што і ён доўга не заляжыцца.

Алесь Бадак адзначыў, што запатрабаваная не толькі беларуская проза, але і паэзія. Хутка раскупляецца серыя «Сто вершаў» — сумесны праект выдавецтва і Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, у якім найлепшыя вершы беларускіх паэтаў суправаджаюцца рэпрадукцыямі цудоўных карцін беларускіх мастакоў. Летась у выдавецтве абнавілі і аднавілі бібліятэчку беларускай паэзіі. Выйшла ўжо шэсць невялікіх, зручных для чытання брашур: Максім Багдановіч, Максім Танк, Анатоль Грачанікаў, Яўгенія Янішчыц... Усе зборнікі хутка разышліся, у тым ліку зборнік нашага сучасніка Генадзя Пашкова. І на наступныя выпускі серыі ўжо ёсць папярэднія замовы. Напрыклад, зборнік Аркадзя Куляшова, юбілей якога адзначаецца ў наступным годзе, бібліятэкі і кнігарні ўжо замовілі ў колькасці дзевяцісот асобнікаў.



Намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» — галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Віктар Шніп — расказаў пра публікацыі, якія адбыліся за год у «Полымі». Гэта 52 паэтычныя падборкі, сярод іх вершы лаўрэатаў дзяржаўных прэмій Міхася Башлакова і Генадзя Пашкова. Былі надрукаваныя байкі Георгія Марчука, які не так даўно сышоў з жыцця і незадоўга да смерці паспрабаваў засвоіць складаны жанр байкапісання. Апублікаваныя тры раманы — «Партрэт» Алеся Кажадуба, які ў хуткім часе выйдзе ў «Мастацкай літаратуры» асобнай кніжкай, «Любі бліжняга твайго» Уладзіміра Гаўрыловіча і «Непераможны злом» Віктара Праўдзіна. Дарэчы, раман Уладзіміра Гаўрыловіча «Па веры вашай...», які сёлета атрымаў Нацыянальную літаратурную прэмію, напачатку з'явіўся на старонках «Полымя», а потым выдадзены кнігай у Выдавецкім доме «Звязда». Друкаваліся таксама шматлікія аповесці і апавяданні... Шмат увагі прыцягнула публікацыя дзённікаў Вячаслава Адамчыка, прачытаўшы якія, можна ўбачыць, чым жыла літаратарская тусоўка канца 1980-х. Віктар Шніп адзначыў і адметныя навуковыя публікацыі. Цікавымі атрымаліся матэрыялы, прысвечаныя 140-годдзю Янкі Маўра. Да юбілею было апублікавана і не вядомае дагэтуль апавяданне класіка «Першая ластаўка». Адбыўся таксама цікавы круглы стол «Ты не глыбінка — глыбіня», прысвечаны дзейнасці абласных аддзяленняў СПБ.

Віктар Шніп распавёў і пра дзейнасць часопісаў «Нёман» і «Маладосць», якія таксама цяпер выходзяць пры выдавецтве «Мастацкая літаратура»:

— Моладзь не баіцца ніякіх жанраў. За час майго рэдактарства ў «Полымі» яшчэ ніхто са сталых аўтараў не прынёс вартых друку паэм, а вось у «Маладосці» паэмы друкуюцца — і эксперыментатарскія, і тыя, што абапіраюцца на класічныя традыцыі. Словам, серыя «Залатая калекцыя беларускай літаратуры», магчыма, дапоўніцца ў будучым тымі творамі, якія сёння з'яўляюцца на старонках нашых часопісаў.

Першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах адзначыла, што адзін з накірункаў СПБ — работа з маладымі.

— Нам вельмі важна расціць чытача. Два гады запар мы ў Саюзе ў снежні праводзім пленум, летась ён быў прысвечаны дзіцячай літаратуры, сёлета меў назву «Літаратура і выхаванне». Вельмі важна, што на пашыраным пленуме мы, пісьменнікі, разам з выдаўцамі, прадстаўнікамі бібліятэк, настаўнікамі гаварылі, як зрабіць, каб нашы юныя беларусы чыталі.

Алена Стэльмах звярнула ўвагу на міжнародныя праекты, якія ажыццяўляе СПБ, — нядаўна Саюз наведала дэлегацыя Башкартастана, прайшлі Дні башкірскай літаратуры, цяпер рыхтуецца анталогія твораў беларускіх і башкірскіх пісьменнікаў. Ва Узбекістане пабачыў свет часопіс «Звезда Востока» з творамі беларускіх пісьменнікаў. Згадала Алена Стэльмах і праект «Сучасная літаратура краін СНД», які неаднойчы прэзентаваўся ў сталіцах краін СНД, а анталогіі гэтай серыі з лепшымі ўзорамі нацыянальных літаратур былі нядаўна ў Бішкеку ўручаныя кожнаму з кіраўнікоў краін СНД.

Прэс-прэзентацыя ў галерэі «Лабірынт» прайшла са святочным настроем, на фоне навагодняй ялінкі, у суправаджэнні чароўнага гуку цымбалаў ансамбля «Вярба» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка пад кіраўніцтвам Вольгі Андрыенка. Акрамя галоўнай бібліятэкі краіны, арганізатарамі былі Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы, Саюз пісьменнікаў Беларусі, выдавецтва «Мастацкая літаратура» і газета «Літаратура і мастацтва». Застаецца спадзявацца, што выданні, пра якія ішла гаворка, стануць для кагосьці выдатным навагоднім падарункам.

**Людміла ІВАНОВА.**

Вернісаж

# ПРАЗ КОЛЕРЫ — ДА СЭРЦА

**У Нацыянальным мастацкім музеі адкрылася выстава, прысвечаная творчасці народнага мастака БССР Івана Ахрэмчыка, чыё імя носіць знакаміты «парнат» — гімназія-каледж мастацтваў. Выстава прымеркаваная да 120-годдзя майстра і называецца «Іван Ахрэмчык. Майстар. Людзі. Эпоха».**



Мастак нарадзіўся ў Мінску, у сям'і рамесніка, ён увасобіў свой родны горад у многіх сваіх карцінах, некаторыя з іх можна ўбачыць у экспазіцыі і даведацца, як выглядала старая Няміга, Верхні горад і іншыя мінскія раёны. Іван Восіпавіч — прыклад чалавека, які ўпарта і нязломна ідзе па сваім прызванні. Ужо ў пятнаццаць гадоў паступіў у Пензенскую мастацкую вучэльню, потым займаўся ў Вышэйшых мастацка-тэхнічных майстэрнях у Маскве, дзе выкладалі вядомыя дзеячы мастацтва, адчувалася ўсё віраванне культуры 1920-х з эксперыментатарствам, жаданнем ствараць па-новаму. У 1930-х Іван Ахрэмчык вярнуўся ў Беларусь, якой і прысвяціў усю сваю творчую дзейнасць. Нездарма ўспамінаюць пра ягоную неабыякавасць, актыўную грамадскую пазіцыю. У 1939-м Ахрэмчыка прызначылі галоўным мастаком Усебеларускай выставы ў Маскве — менавіта праз яго бачанне мастака была прадстаўленая БССР. А паралельна займаўся выкладаннем, выхаваў многіх выдатных мастакоў, сярод якіх — Міхаіл Савіцкі, які заўсёды вельмі цёпла адзываўся аб сваім настаўніку.

На пачатку 1941-га Ахрэмчык быў абраны старшынёй Саюза беларускіх мастакоў. Але ўсе планы парушыла вайна. Гады эвакуацыі на Урале, напружаная праца, чаканне Перамогі... У Нацыянальным мастацкім музеі можна пабачыць палотны майстра на тэму Вялікай Айчыннай вайны, напрыклад, напісаную ў 1957-м годзе карціну «Абаронцы Брэсцкай крэпасці», якая ўваходзіць у пастаянную экспазіцыю музея. Не паспеў ён закончыць палатно, над якім працаваў да апошніх дзён — «Жанчыны Брэсцкай крэпасці», але карціна і ў незавершаным выглядзе ўражвае, яе дэманструюць у мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць — герой».

Карціны мастака пазнаеш адразу — выразны стыль, часам суровы, але пры гэтым заўсёды вельмі эмацыянальны, са складаным спалучэннем колеравых нюансаў. На юбілейнай выставе прадстаўлена ўся разнастайнасць ягонай творчай палітры — пейзажы, партрэты (а Ахрэмчык лічыўся адным з лепшых партрэтыстаў эпохі), марынорты, буйнафарматныя работы на гістарычную тэму. Ёсць і экзатычная тэматыка — у 1959-м годзе пасля паездкі ў Манголію мастак стварыў цыкл пейзажаў, адлюстраваўшы нязвыклую для нас прыгажосць стэпаў і пустыняў.

Наведаць выставу можна да 21 студзеня 2024 года.

**Людміла ІВАНОВА.**

## ООО «СпецРеализация»
**объявляет о проведении вторых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица –**

## ООО «Белнефтетранзит»

(УНП 191750278, г. Минск, ул. Украинская, 27-9а).

***Дата и время проведения торгов*: 03 января 2024 года.**

Начало – 12.00. Заявки принимаются с 23 декабря 2023 года по 01 января 2024 года.

***Место проведения торгов:*** Минск, проспект Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «Белнефтетранзит» (УНП 191750278**) в лице ликвидатора – директора ООО «АзимутКонсалт» Радченко К.И., тел. 8 (029) 156-86-96.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте http://www.specrealization.by.

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375291568696, Радченко Кирилл Игоревич; +375296847176, Яскевич Дмитрий Васильевич.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 180 (30060) за 16.09.2023, РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 212 (30092) за 01.11.2023.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
по поручению **ОАО «Типография «Победа»** (продавец)
проводит повторный открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ ПРОИЗВОДСТВЕННОГО УЧАСТКА

*(в состав входят: пристройка, склад, гараж, забор, тротуар, калитка, ворота, асфальтное покрытие)*

**общей площадью 223,9 кв. м с инв. № 633/С-10471, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624050100001000113 (право постоянного пользования) площадью 0,1103 га по адресу: Минская область, Мядельский район, г. Мядель, ул. Юбилейная, 6.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **70 900,70** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **7 090,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 20 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 05.02.2021, 08.05.2021, 27.01.2022, 16.03.2023, 25.10.2023.

Аукцион состоится **09.01.2024** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.01.2024** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра (8029) 339 76 42.**

УНП 600074908

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор аукциона)*
по поручению **ОАО «Агро-Дубинское»** *(Продавец)*
проводит открытый аукцион по продаже:

Лот № 1: **здание конюшни с инв. № 632/С-32162 общей площадью 128,2 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622083004301000085 (*права постоянного пользования*) площадью 0,0702 га по адресу: Воложинский район, Дорский с/с, д. Лужаны, д. 61а.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **9 120,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены 912,00 бел. руб.
**Стоимость снижена на 20 %.**

Лот № 2: **здание кормоцеха с инв. № 632/С-32025 общей площадью 274,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622081700001000259 площадью 0,8064 га *(участок находится в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, право постоянного пользования)* по адресу: Воложинский район, Воложинский с/с, 31, 0.7 южнее д. Маршалки.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **55 926,96** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – 5 592,00 бел. руб.
**Стоимость снижена на 20 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, по лоту № 1 в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лоту № 2 – 5 (пяти) процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 05.10.2023.

Аукцион состоится **08.01.2024** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.01.2024** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64.**
**Тел. для осмотра (8029) 376-87-46.**

УНН 600017962

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Лидская обувная фабрика»

**Аукцион состоится 11.01.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-52816 (назначение – здание специализированное складов, хранилищ, наименование – здание блока складов), площадью 792,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 26В.<br>ЛОТ 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 423650100007001038 (назначение – для обслуживания здания блока складов), площадью 0,1324 га по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 26В. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, расположенный в охранной зоне сетей и сооружений водоснабжения, код – 13,4, площадью 0,0078 га.<br>Условия аукциона:<br>- возмещение победителем аукциона (лицом приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по проведению независимой оценки объекта в размере 429 руб.;<br>- возмещение победителем аукциона (лицом приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца за составление выписки из регистрационной комиссии о правах (ограничениях и обременениях) прав на объект в размере 29,00 руб.;<br>- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта |
| **Начальная цена продажи** | 79 464 руб. (семьдесят девять тысяч четыреста шестьдесят четыре рубля) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 7 946 руб. (семь тысяч девятьсот сорок шесть рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 09.01.2024 г. до 15.00** |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении повторного открытого аукциона
по продаже права заключения договора аренды **сроком на три года** имущества,
находящегося в собственности Республики Беларусь
и переданного **ОАО «Криница»** (Продавец)
по договору безвозмездного пользования

Аукцион состоится **16.01.2024 в 11.00** по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1:**
**Право заключения договора аренды части здания транспортной проходной зоны выезда с инв. № 500/С-25376.**
Площадь, сдаваемая в аренду, – 109,4 кв. м.
Начальная цена с НДС 20 % – 462,76 руб.

**Лот № 2:**
**Право заключения договора аренды части здания транспортной проходной зоны выезда с инв. № 500/С-25376.**
Площадь, сдаваемая в аренду, – 517,40 кв. м.
Начальная цена с НДС 20 % – 2 188,60 руб.

Адрес Лотов №№ 1–2: г. Минск, ул. Радиальная, 52/14.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на «Электронной торговой площадке GOSTORG.BY» Организатора аукциона (gostorg.by).

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

Аукцион состоится **23.01.2024,** начало: 10.00, окончание: 16.00 на электронной торговой площадке (далее – ЭТП) iintorgi.by.
Время приема заявок: **с 23.12.2023 09.00 до 22.01.2023 г. 17.00**

**Организатор аукциона:** ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by, iintorgi.by

**Продавец:** ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

**Лот № 1:** имущество СПА-салона,
состоящее из 33 единиц, бывшее в употреблении.
**Начальная цена с учетом НДС 20 %** – 5 553,00 бел. руб.
**Минимальная цена** – 4 442,40 бел. руб.
**Размер задатка** – 10 % от начальной цены лота.
**Шаг торгов** – 5 % от начальной цены лота.
**Порядок оформления участия в аукционе, условия участия и порядок проведения аукциона, информация об имуществе, входящем в состав** лота, размещены на официальном сайте ЭТП «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by.
Задаток перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа ООО «Индустрия Инноваций».

**Контакты: тел: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продажe имущества частного предприятия «ЗИАНД»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Запчасти для машиностроения/автомобилестроения/ремонта автомобиля (Шпагат полипропиленовый, Амортизатор, Баки, Болты, Валы, Винты, Вкладыши, Втулки, Выключатели, Гайки, Датчики, Диски, Заглушки, Клапаны, Кольца, Контргайки, Кронштейны, Крышки, Манжета, Маслопроводы, Муфты, Насосы, Оси, Пальцы, Патрубки, Переключатели, Пластины, Поводки, Подшипники, Поршни, Прокладки, Проушины, Пружины, Распылители, Реле, Ремни, Рукава, Рычаги, Сателлиты, Стяжки, Сухари, Трубы, Трубки, Тяга, Стартеры, Стаканы, Уплотнение, Устройство запорное, Шайбы, Шестерни, Шпонки, Штифты, Штуцеры, Щетки, Вентилятор, Вилка, Воздухоочиститель, Вставка, Гидроцилиндр, Гильза, Игла, Кардан, Картер, Кнопка, Кожух, Комплект колец, Комплект полотен, Ком-т болта и гайки, Контрольный элемент, Кран, Лампа, Лента, Масленка, Масломер, Маслоотражатель, Нож, Обойма, Опора, Переходник, Предохранитель, Привод (бендикс), Пробка, Радиатор, Рассеиватель, Ремкомплект, Сердцевина радиатора, Статор, Стойка, Ступица, Термостат, Угольник, Упор, Фара, Фильтр, Форсунка, Чехол, Шланг, Шпилька, Штанга в ассортименте). Всего деталей в количестве 27 845 (Двадцать семь тысяч восемьсот сорок пять) штук | 35 631,52 | 3 563,15 | 1 781,58 |
| В отношении лота проводятся первые торги | | | | |
| **Местонахождение:** 223017, Минская обл., Минский р-н, с/с Луговослободской, д. Синило, ул. Солнечная, д. 2а | | | | |
| **Дата и время проведения торгов** | **25 января 2024 года в 14.30 (регистрация – с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 | | | |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **с 10.00 25 декабря 2023 года до 16.00 23 января 2024 года** | | | |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту 1, частное предприятие «ЗИАНД», проводимых 25.01.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Анатолий, +375447513892.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **Частное предприятие «ЗИАНД» в лице ликвидатора – ООО «С чистого листа», тел. (8-044) 751-38-92 (223017, Минская обл., Минский р-н, с/с Луговослободской, д. Синило, ул. Солнечная, д. 2а)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# КАНІКУЛЫ: І ЗАХАПЛЯЛЬНА, І ПАЗНАВАЛЬНА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— На базе ўстаноў адукацыі ў зімовыя канікулы будуць праходзіць азараўленне больш за 66 тысяч школьнікаў, — паведаміла **кансультант упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Таццяна АСМАЛОЎСКАЯ**. — Гэта пераважна лагеры з дзённым рэжымам знаходжання для дзяцей малодшага школьнага ўзросту, дзе малыя знаходзяцца пад наглядам дарослых, забяспечваюцца харчаваннем, іх уцягваюць у розныя цікавыя і карысныя мерапрыемствы...

«Усе гурткі і секцыі падчас зімовых канікулаў будуць працаваць у штатным рэжыме. Безумоўна, падкарэкціруюць іх расклад з улікам таго, што работа вядзецца ў канікулярны перыяд, — удакладніла спецыяліст. — Гэта робіцца для таго, каб школьнікам, не занятым вучобай, было больш зручна прыходзіць на заняткі ў першую ці другую змену (у залежнасці ад таго, як былў арганізаваны працэс навучання ў школе).

Што датычыцца сацыяльна неабароненай катэгорыі дзяцей, то яны знаходзяцца ў зоне ўвагі кожнага педагога. Для іх прапанаваны, скажам так, маршрутныя лісты, як бяспечна і з карысцю правесці зімовыя канікулы».

Па словах Таццяны Асмалоўскай, шмат актыўнасцяў, квэстаў, цікавых дыялогавых пляцовак прапануюць грамадскія аб'яднанні — Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя і Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.

З 15 снежня ў краіне стартавала штогадовая навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці», якая ўключае як рэспубліканскія мерапрыемствы, так і ўрачыстасці ў абласцях і ў сталіцы.

Ва ўсіх рэгіёнах краіны праходзяць навагоднія паказы. Кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў наведваюць дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы і дамы сямейнага тыпу, бальніцы, апякунскія і прыёмныя сем'і, віншуюць дзяцей з надыходзячым Новым годам і ўручаюць падарункі, а таксама аказваюць дапамогу ў вырашэнні існуючых праблем. Да дабрачыннай акцыі далучаюцца студэнцкая моладзь, грамадскія аб'яднанні і іншыя арганізацыі.

Сярод самых яркіх святочных мерапрыемстваў, якія пройдуць на зімовых канікулах, варта адзначыць Рэспубліканскі навагодні баль у Палацы Незалежнасці, які адбудзецца 27 снежня і аб'яднае 350 прадстаўнікоў навучэнскай моладзі з усіх рэгіёнаў краіны.

У Палацы Рэспублікі з 23 снежня да 4 студзеня будзе праходзіць фантастычная навагодняя казка «Машына навагодняга часу». На галоўную ёлку краіны запрошаны амаль 2,5 тысячы дзяцей ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў: дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, дзеці, якія выхоўваюцца ў апякунскіх і прыёмных сем'ях; выхаванцы кадэцкіх вучылішчаў; дзеці з сем'яў бежанцаў; навучэнцы-пераможцы міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных алімпіяд, творчых конкурсаў, фестываляў, спартыўных спаборніцтваў; навучэнцы, якія дасягнулі поспехаў у грамадскай рабоце.

«Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства адкрыты для дзяцей і моладзі з усёй краіны, — запэўнівае **загадчык аддзела метадычнай работы ўстановы дадатковай адукацыі Алена ПАНАШЧЫК**. — Зімовыя канікулы абавязкова павінны праходзіць у фармаце яркіх уражанняў. Нам важна пакінуць у дзяцей цёплыя пачуцці, што яны выдатна адпачылі і правялі час з карысцю».

Першае яркае мерапрыемства, якое дазволіць акунуцца ў зімовую казку дзецям і дарослым, гэта выстава-конкурс юных фларыстаў «Лёд. Кветкі. Фантазія», што адкрыецца ў цэнтры ўжо 26 снежня і будзе працаваць на працягу зімовых канікул. У адной з намінацый — «Навагоднім атэлье» — будзе прадстаўлена фларыстычнае афармленне калядинай ці навагодняй сукенкі. Кожная наведвальніца зможа адчуць сябе прынцэсай, прымераць навагоднюю сукенку і сфатаграфавацца ў ёй у спецыяльнай фотазоне.

Таксама на выставе-конкурсе будуць прадстаўлены і іншыя намінацыі: «Навагодні букет «Снежныя фантазіі», сюрпрызная работа «Падарунак Дзеда Мароза». Цэнтральнымі экспанатамі стануць скульптуры сімвала года — дракона. На выставу прывезена ўжо больш за 50 экспанатаў з усіх рэгіёнаў краіны. Яны будуць прадстаўлены ў дзіўным фларыстычным афармленні.

Таксама падчас зімовых канікулаў для дзяцей з рэгіёнаў краіны ў Рэспубліканскім цэнтры экалогіі і краязнаўства будзе арганізавана экскурсійная адукацыйная праграма «Падарожжа ў экасвет». 29 снежня пройдзе фестываль зімовага арыентавання. 30 снежня — спартыўнае свята на скаладроме «Нас клічуць снежныя вяршыні». На працягу ўсіх зімовых канікул школьнікаў запрашаюць на самыя разнастайныя майстар-класы: «Ёлачная цацка», «Навагодні сувенір», «Прасторавы аналіз гісторыка-культурных аб'ектаў», «Навагодні дэтэктыў», «Сонейка ў далоньках» і іншыя.

У Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей юных наведвальнікаў чакаюць рэспубліканская выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Калядная зорка», конкурс малюнка «Выбары вачыма дзяцей», II Рэспубліканскі квіз-праект.

На зімовых канікулах Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны запрашае на тэматычныя экскурсіі: «Артылерыя — бог вайны» (для пяцікласнікаў), «Зброя герояў» (8 клас), «Карэнны пералом і савецкі тыл» (8 клас), «Стралковая зброя з калекцыі фондаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны» (8 клас), «Беларусь партызанская» (9 клас), « Нацысцкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ў 1941—1944 гг.» (9 клас). Малодшых школьнікаў чакаюць у якасці ўдзельнікаў інтэрактыўнай праграмы «Аперацыя «Выратуем Новы год!» (1—4 класы).

Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь арганізуе выставачныя праекты: «Музей ёлачных цацак», «Беларусь і беларусы. Гід па гісторыі і культуры»; «1000 рарытэтаў Беларусі» , «Друкарскі двор XVI стагоддзя» і іншыя.

Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк прапануе наведаць аглядную экскурсію па выставачных экспазіцыях, інтэрактыўную асветніцкую студыю «Экатэхнум» з калекцыяй экспанатаў, якія дазваляюць проста і даступна расказаць навучэнцам аб тым, як уладкаваны навакольны свет і чаму важна яго берагчы, а таксама Музей гісторыі прафесійнай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Напярэдадні зімовых канікул педагагічныя работнікі нагадваюць навучэнцам правілы бяспечных паводзін: на аўтамабільных дарогах і пешаходных пераходах, правілы пераходу чыгуначных пуцей, аб недапушчальнасці знаходжання на рэчках і вадаёмах, аб захаванні норм пажарнай бяспекі. Будуць таксама праведзены прафілактычныя гутаркі аб выкананні норм паводзін у грамадскіх месцах, зроблены акцэнт на выкарыстанне святлоадбівальных элементаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Ад Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь

# АБ РАБОТАХ, ДАПУШЧАНЫХ ДА ЎДЗЕЛУ Ў КОНКУРСЕ НА САІСКАННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 2024 года

*У адпаведнасці з пунктам 9 Палажэння аб Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 2006 г. № 300 «Аб Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь», з мэтай шырокага азнаямлення грамадскасці, прадстаўляецца інфармацыя аб работах і аўтарскіх калектывах, якія допушчаны да ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2024 года.*

**Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі паведамляе,** што да ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі 2024 года дапушчаны наступныя работы і аўтарскія калектывы:

***Гардзей Валерый Вітальевіч, Шкадарэвіч Аляксей Пятровіч, Дземічаў Яўгеній Яўгенавіч, Жыбуль Сяргей Віктаравіч, Кінчыкаў Ігар Уладзіміравіч, Шаброў Алег Васільевіч.*** Работа «Распрацоўка, асваенне вытворчасці і экспартныя пастаўкі сістэм радыёэлектроннай барацьбы для абароны ад беспілотных лятальных апаратаў».

*Вылучана* адкрытым акцыянерным таварыствам «КБ Радар» — кіруючая кампанія холдынга «Сістэмы радыёлакацыі».

*Прадстаўлена* Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэтам Рэспублікі Беларусь;

***Сахарук Дзмітрый Аляксандравіч, Круглікаў Сяргей Уладзіміравіч, Сівашка Аляксандр Барысавіч, Шабанаў Віктар Паўлавіч, Барадзін Віктар Валянцінавіч.*** Работа «Стварэнне тактычнага беспілотнага авіяцыйнага комплексу оптыка-электроннай паветранай разведкі блізкага дзеяння».

*Вылучана* ўстановай адукацыі «Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь».

*Прадстаўлена* Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь;

***Лапа Віталій Вітальевіч, Цыганаў Аляксандр Рыммавіч, Пірагоўская Галіна Уладзіміраўна, Чарнякоў Дзмітрый Уладзіміравіч, Дармешкін Алег Барысавіч.*** Работа «Распрацоўка, вытворчасць і прымяненне новых форм комплексных мінеральных угнаенняў у Рэспубліцы Беларусь».

*Вылучана* рэспубліканскім навуковым дачэрнім унітарным прадпрыемствам «Інстытут глебазнаўства і аграхіміі».

*Прадстаўлена* Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі;

***Длугуновіч Вячаслаў Андрэевіч, Жагора Мікалай Адамавіч, Ісаевіч Анатоль Уладзіміравіч, Нікаленка Сяргей Віктаравіч, Тарасава Вольга Барысаўна.*** Работа «Стварэнне нацыянальнай сістэмы метралагічнага забеспячэння Рэспублікі Беларусь у галіне лазернай тэхнікі і оптыкі».

*Вылучана* дзяржаўнай навуковай установай «Інстытут фізікі імя Б.І. Сцяпанава Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».

*Прадстаўлена* Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі;

***Басякоў Міхаіл Нічыпаравіч, Вягера Іван Іванавіч, Дэвойна Алег Георгіевіч, Жарскі Уладзімір Уладзіміравіч, Залескі Віталій Генадзьевіч, Руды Віктар Віктаравіч.*** Работа «Распрацоўка і ўкараненне высокаэнергетычных тэхналогій і абсталявання для апрацоўкі матэрыялаў з мэтай павышэння канкурэнтаздольнасці прадукцыі машынабудавання».

*Вылучана* дзяржаўнай навуковай установай «Фізіка-тэхнічны інстытут Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».

*Прадстаўлена* Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі;

***Абламейка Сяргей Уладзіміравіч, Жураўкоў Міхаіл Анатольевіч, Басякоў Сяргей Міхайлавіч, Недзьведзь Аляксандр Міхайлавіч, Шчарбакоў Сяргей Сяргеевіч, Богуш Рыхард Пятровіч.*** Работа «Мадэлі і тэхналогіі штучнага інтэлекту і іх прымяненне ў рэальным сектары эканомікі і сацыяльнай сферы Рэспублікі Беларусь».

*Вылучана* Беларускім дзяржаўным універсітэтам.

*Прадстаўлена* Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь;

***Богуш Вадзім Анатольевіч, Валкавец Аляксандр Іванавіч, Гусінскі Аляксандр Уладзіміравіч, Кандрашоў Дзяніс Аляксандравіч, Капшай Аляксей Андрэевіч, Свірыд Максім Сяргеевіч.*** Работа «Распрацоўка і асваенне вытворчасці радыёвымяральнага абсталявання міліметровага дыяпазону даўжынь хваль».

*Вылучана* ўстановай адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі».

*Прадстаўлена* Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь;

***Мінчык Андрэй Мікалаевіч, Маліноўскі Аляксандр Анатольевіч, Голубеў Валерый Вячаслававіч, Домаш Генадзій Вячаслававіч, Касцюк Сяргей Міхайлавіч, Сідарэвіч Віктар Іванавіч.*** Работа «Стварэнне комплексу інавацыйных імпартазамяшчальных машын для дарожна-будаўнічай галіны».

*Вылучана* адкрытым акцыянерным таварыствам «АМКАДОР» — кіруючая кампанія холдынгу».

*Прадстаўлена* Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

**Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры паведамляе,** што да ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры 2024 года дапушчаны наступныя работы і творчыя калектывы:

***Маторная Ганна Дзмітрыеўна, Лісавенка Таццяна Вітальеўна, Ламановіч Ніна Іосіфаўна, Громаў Уладзімір Валер'евіч, Шабеця Дзмітрый Алегавіч, Кеда Аляксандр Аляксандравіч.*** Оперны спектакль «Дзікае паляванне караля Стаха» У. Солтана ў пастаноўцы Вялікага тэатра Беларусі 2021 года.

*Вылучаны* Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатрам оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

*Прадстаўлены* Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам будаўніцтва і архітэктуры Рэспублікі Беларусь;

***Бельцюкоў Віктар Уладзіміравіч, Ганчароў Аляксандр Міхайлавіч, Заяц Ірына Валянцінаўна, Малахаў Валерый Юр'евіч, Первіцкі Сяргей Віктаравіч, Шах Сафія Мікалаеўна.*** Работа «Праектаванне і стварэнне гісторыка-культурнага аб'екта «Мемарыяльны комплекс «Ола» ў Светлагорскім раёне Гомельскай вобласці».

*Вылучана* Светлагорскім раённым выканаўчым камітэтам.

*Прадстаўлена* Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам будаўніцтва і архітэктуры Рэспублікі Беларусь.

Камітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь, падкамітэт па Дзяржаўных прэміях у галіне навукі і тэхнікі, падкамітэт па Дзяржаўных прэміях у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры звяртаецца да кіраўнікоў арганізацый, устаноў, вышэйшых навучальных устаноў, прадпрыемстваў, органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх аб'яднанняў з просьбай прыняць удзел у абмеркаванні пералічаных работ і аўтарскіх калектываў.

Водзывы спецыялістаў, матэрыялы грамадскага абмеркавання, прапановы і заўвагі па работах, аўтарскіх калектывах і аўтарах прымаюцца да 15 верасня 2024 года па адрасе: 220072, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 66, каб. 317, сакратарыят Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь.

**Тэл./факс (017) 275-24-56.**

УНП 101078490

# КАДРЫ Ў ДЭФІЦЫЦЕ

## Чаму пашыраецца глабальны недахоп работнікаў?



**Колькасць насельніцтва Зямлі, паводле ацэнак ААН, перавысіла 8 мільярдаў чалавек, аднак свет сутыкаецца з маштабным дэфіцытам кадраў. Недахват працоўнай сілы ўяўляе сур'ёзную праблему для прадпрыемстваў па ўсім свеце. Паводле даследавання АЭСР, які ахоплівае 40 краін, кадравы голад адчуваюць больш за 70 працэнтаў кампаній. Дэфіцыт работнікаў назіраецца ў розных сектарах, у тым ліку ў апрацоўчай прамысловасці, будаўнічай і транспартнай галінах, сельскай гаспадарцы, ахове здароўя, інжынерыі, навуцы і тэхналогіях, асабліва інфармацыйна-камунікацыйных. Чаму разгарнуўся глабальны кадравы голад?**

### «Бэбі-бумеры» на пенсіі

Кадравы голад становіцца глабальнай праблемай. Падобная сітуацыя назіраецца на рынках працы большасці вядучых краін, у тым ліку ЗША, Вялікабрытаніі і дзяржаў Еўрасаюза. Трывожная тэндэнцыя адзначаецца ў дакладзе Раскангрэса, паведаміла РІА «Новости». «Праблема недахопу працоўных рэсурсаў мае глабальны характар. На працягу многіх гадоў яна часта вырашалася шляхам пераносу вытворчасці ў краіны з больш нізкім коштам працоўнай сілы. Аднак цяпер нават такія вытворчыя цэнтры, як Кітай, Індыя, Бангладэш і В'етнам, нараўне з Аргенцінай, Калумбіяй і Турцыяй, сутыкаюцца з недахопам працоўнай сілы і неадпаведнасцю ўзроўню кваліфікацыі, што пагражае цэламу шэрагу галін», — адзначаецца ў дакладзе.



«Пры агульнасусветнай тэндэнцыі зніжэння нараджальнасці дэфіцыт працоўнай сілы будзе захоўвацца. Па некаторых ацэнках, да 2030 года ва ўсім свеце з-за недахопу кваліфікаваных спецыялістаў могуць застацца незанятымі больш за 85 мільёнаў працоўных месцаў, што прыкладна адпавядае насельніцтву Германіі», — прагназуюць эксперты Раскангрэса.

Адной з галоўных прычын дэфіцыту з'яўляюцца дэмаграфічныя фактары, найперш старэнне насельніцтва. У развітых краінах, такіх як ЗША, Канада, Італія, Германія, Японія, Аўстралія, Вялікабрытанія і Францыя, пакаленне «бэбі-бумераў» старэе і ідзе на пенсію. Акрамя таго, адукацыя людзей часта не адпавядае навыкам, якія запатрабаваны рынкам. Недахват кваліфікаваных кадраў назіраецца нават у Індыі, дзе агульная прапанова працоўнай сілы пакуль расце хутчэй, чым попыт.

Адным з галоўных фактараў узмацнення кадравага голаду па ўсім свеце стала пандэмія каранавіруса. Некалькі гадоў маштабных абмежаванняў кардынальна змянілі звычкі людзей. Дзясяткі тысяч супрацоўнікаў буйных, сярэдніх і невялікіх кампаній страцілі працоўныя месцы ў сувязі з масавымі скарачэннямі, сотні прадпрыемстваў былі вымушаны закрыцца, а тыя арганізацыі, якім удалося ўтрымацца на плаву, у большасці сваёй перавялі персанал на аддаленую працу.

У выніку пасля пандэміі рынак працы зведаў значныя змяненні. Некалькі гадоў, праведзеных па-за сценамі офісаў, прывялі да таго, што работнікі пачалі адмаўляцца вяртацца ў дзелавыя цэнтры. Выправіць сітуацыю не дапамаглі нават пагрозы звальнення. Імклівы выхад на рынак тысяч новых кампаній, у сваю чаргу, дазволіў людзям не баяцца страціць работу, бо знайсці новае месца стала значна прасцей.

### Рынак саіскальніка

Нежаданне тысяч супрацоўнікаў спяшацца з выбарам новай работыператварыла амерыканскі рынак работадаўцы (кандыдатаў больш, чым вакансій) у рынак саіскальніка (супрацьлеглая сітуацыя). Сёлета да сярэдзіны лістапада колькасць размешчаных вакансій у Злучаных Штатах значна перавысіла колькасць кандыдатаў, паведаміла lenta.ru. Дырэктар па глабальнай палітыцы занятасці і спецыяльных ініцыятывах Гандлёвай палаты ЗША Стэфані Фергюсан назвала праблему кадравага дэфіцыту беспрэцэдэнтнай. Паводле даных ведамства, да сярэдзіны мінулага месяца ў краіне было адкрыта 9,6 мільёна вакансій, у той час як сумарная колькасць беспрацоўных ацэньвалася ў 6,4 мільёна чалавек. Гэта значыць, нават калі ўсе беспрацоўныя раптоўна захацелі б знайсці новае месца, у ЗША ўсё роўна заставалася б 3,2 мільёна вакансій.

У разгар пандэміі ў ЗША закрыліся 120 тысяч прадпрыемстваў, а больш за 30 мільёнаў супрацоўнікаў засталіся без работы. Запоўніць свабодныя нішы пакуль не ўдаецца ні з дапамогай прыцягнення мігрантаў з іншых краін, як гэта рабілася раней, ні павышэннем заробкаў, ні стварэннем спецыяльных курсаў па перападрыхтоўцы кадраў. Сітуацыя пагаршаецца тым, што за час пандэміі дзясяткі тысяч амерыканцаў настолькі прывыклі да штомесячных дапамог (ад 150 да 650 долараў у тыдзень), што за некалькі гадоў абмежаванняў значная частка грамадзян змагла назапасіць дастаткова, каб не спяшацца з пошукам новага месца. Усе гэтыя фактары разам з агульным недахопам працоўных рэсурсаў пагражаюць амерыканскай эканоміцы запаволеннем тэмпаў росту і зніжэннем прадукцыйнасці працы.

### Шкода на трыльён долараў

Узмацненне кадравага голаду накладваецца на масавыя звальненні супрацоўнікаў. Калі ў 2021-м звольніліся ў агульнай складанасці 47,8 мільёна амерыканцаў, то ў 2022-м — ужо больш за 50 мільёнаў. Адпаведная тэндэнцыя захоўваецца і сёлета. Многія не спяшаюцца шукаць новую работу: яны спасылаюцца на неабходнасць папраўіць здароўе ці клапаціцца пра дзяцей. Іх магло б матываваць павышэнне зарплаты, але на такі крок наўрад ці гатовы амерыканскія работадаўцы.

Недахват кваліфікаваных работнікаў закрануў усе ключавыя галіны амерыканскай эканомікі — ад прамысловасці да праграмавання. Найбольшы кадравы голад эксперты Гандлёвай палаты ЗША зафіксіравалі ў фінансавым і дзелавым сектарах. У гэтых галінах незанятымі аказаліся больш за 60 працэнтаў вакансій. Крыху лепшая сітуацыя ў забаўляльным і гасцінічным бізнесе — тут вакантнымі застаюцца 45 працэнтаў аб'яў. У сектары апрацоўчай прамысловасці, якая страціла каля 1,4 мільёна працоўных месцаў у разгар пандэміі, па стане на жнівень незапоўненымі заставаліся ў агульнай складанасці 616 тысяч вакансій. Пры гэтым да 2030-га ў гэтым сектары незанятымі могуць аказацца да 2,1 мільёна працоўных месцаў, што нанясе амерыканскай эканоміцы шкоду ў трыльён долараў.

Справіцца з паглыбленнем кадравага дэфіцыту ў ідэале магло б больш актыўнае прыцягненне мігрантаў. Напрыклад, у адной толькі ІТ-індустрыі да нядаўняга часу працавалі сотні тысяч праграмістаў і аналітыкаў з Індыі. Але ў сувязі з масавымі звальненнямі ў падвешаным стане аказаліся 60-80 тысяч выхадцаў з гэтай краіны. Масавага ж прытоку новых мігрантаў на амерыканскім рынку працы ў сярэднетэрміновай перспектыве чакаць не выпадае, падкрэсліў у Гандлёвай палаце. Паводле даных Бюро перапісу насельніцтва ЗША, максімум быў зафіксаваны ў 2015—2016 гадах, калі ў краіну ўехала звыш мільёна мігрантаў. Аднак у 2020-м і 2021-м гэты паказчык склаў усяго 247 тысяч чалавек.



У Гандлёвай палаце падкрэсліваюць, што з улікам старэння насельніцтва, якое працягваецца, і ўсё большай тэхналагічнай аўтаматызацыі кадравы голад у ЗША будзе ўзмацняцца. Амерыканскія работадаўцы будуць адчуваць недахоп кваліфікаваных спецыялістаў на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. Вырашыць жа гэтую праблему практычна немагчыма з прычыны натуральнага змяншэння насельніцтва і адносна малой колькасці маладых пакаленняў, прадстаўнікам якіх яшчэ толькі трэба выйсці на мясцовы рынак працы.

### Голад у каралеўстве

Калі ў ЗША кадравы голад распаўсюдзіўся на ключавыя сферы эканомікі, то ў Вялікабрытаніі праблема недахопу высокакваліфікаваных кадраў закранула ў большай ступені сегмент малога і сярэдняга прадпрымальніцтва (МСП). Згодна з вынікамі даследавання Федэрацыі малога бізнесу, каля 22 працэнтаў прадстаўнікоў МСП заявілі, што кадравы голад стане «перашкодай для росту іх кампаній у 2024 годзе». Найбольш пацярпелай галіной аказаўся сектар інфармацыі, камунікацый і высокіх тэхналогій. У гэтай галіне на праблему з найманнем персаналу паказалі 38 працэнтаў кампаній.

За апошнія некалькі гадоў Вялікабрытанія, як і ЗША, сутыкнулася з рэзкім скарачэннем прытоку мігрантаў. Але калі ў Злучаных Штатах гэта шмат у чым абумоўлена негатыўнымі наступствамі пандэміі каранавіруса, то ў Брытаніі такую тэндэнцыю справакаваў выхад каралеўства са складу Еўрасаюза. Брэксіт, які ўступіў у сілу ў пачатку лютага 2020-га, пацягнуў за сабой рэзкі разрыў міграцыйных сувязяў з кантынентальнымі краінамі. Пандэмія толькі ўзмацніла дынаміку. Праблему пагаршае тое, што многія з еўрапейскіх мігрантаў былі заняты ў фінансавым і банкаўскім сектарах брытанскай эканомікі. Замяніць каштоўных спецыялістаў у гэтых галінах стала больш складана, сцвярджаюць эксперты.

Кадравы голад закрануў не толькі офісных клеркаў, але і іншыя галіны — напрыклад, будаўнічы сектар. У адрозненне ад амерыканскай, якой больш-менш удалося справіцца з крызісам мінулага года, у брытанскай будаўнічай галіне з праблемай найму новых супрацоўнікаў сутыкнулася амаль палова работадаўцаў. Падобная сітуацыя была зафіксавана і ў вытворчым сектары — у гэтай галіне аб недахопе кадраў заявілі прадстаўнікі 28 працэнтаў кампаній. Праблем мясцоваму рынку працы дадае тое, што выпускнікі мясцовых універсітэтаў усё часцей сталі атрымліваць работу, якая не патрабуе вышэйшай адукацыі. Паводле звестак аналітыкаў Інстытута фінансавых даследаванняў, за апошнія 30 гадоў доля такіх выпускнікоў у каралеўстве ўзрасла з 31 да 42 працэнтаў. Гэта магло быць выклікана агульным паскарэннем тэмпу жыцця і павелічэннем яго кошту. Пры такіх умовах патрэба ў «хуткіх» грашах звычайна перавешвае імкненне да ўдасканалення навыкаў і атрымання профільнай працы.

### Інавацыі з мінусам

Калі ў Вялікабрытаніі аб пагрозе росту з-за недахопу кваліфікаваных работнікаў заяўлялі ў асноўным прадстаўнікі малога і сярэдняга бізнесу, то ў краінах Еўрасаюза з вострым кадравым голадам сутыкнуліся і буйныя прадпрыемствы. Так, паводле вынікаў лістападаўскага апытання аналітыкаў сацыялагічнай службы «Еўрабарометр», у высокай патрэбе ў топавых кадрах прызналіся 72 працэнты прадстаўнікоў буйнога бізнесу. Падобная праблема характэрная для ўсіх катэгорый МСП: аб складанасцях з пошукамі высокакваліфікаваных кадраў заявілі 53 працэнты мікрапрадпрыемстваў, 65 працэнтаў малых кампаній і 68 працэнтаў сярэдніх фірм.

Самы востры недахоп аналітыкі зафіксавалі ў тэхналагічным сектары. У дэфіцыце механікі, інжынеры і лабаранты. З цяжкасцямі ў пошуках такіх работнікаў сутыкнуліся 42 працэнты малых і сярэдніх еўрапейскіх кампаній. Праблемы захоўваюцца і з найманнем спецыялістаў па рабоце з кліентамі (адміністратараў, кансультантаў па продажах). Аб адсутнасці неабходнага ўзроўню навыкаў у падобных кандыдатаў заявілі 23 працэнты рэспандэнтаў. У кожнай пятай еўрапейскай кампаніі ўказалі на праблему з найманнем распрацоўшчыкаў і тэхналагічных даследчыкаў. Яшчэ 18 працэнтаў мясцовых кампаній сутыкнуліся з цяжкасцямі пры пошуку высакакласных ІТ-спецыялістаў.

Як лічаць эксперты, кадравы голад, што захоўваецца ў рэгіёне, прывядзе да значнага нарошчвання нагрузкі на супрацоўнікаў, якія ўжо задзейнічаны, а вось іх заробак наўрад ці рэзка павысіцца з-за павелічэння выдаткаў у сувязі з інфляцыяй і ростам цэн на энерганосьбіты. Так, 48 працэнтаў рэспандэнтаў заявілі, што іх работнікі ўжо сутыкнуліся з перапрацоўкамі. Недахоп кваліфікаваных кадраў таксама можа ўдарыць па аб'ёмах продажаў малых прадпрыемстваў. Амаль у кожнай трэцяй (31 працэнт) кампаніі заявілі аб негатыўным уплыве кадравага голаду на пашырэнне збыту прадукцыі. Сярод найбольш распаўсюджаных рызык таксама аказаліся зніжэнне агульнага прыбытку і рэнтабельнасці (па 25 працэнтаў), рост вытворчых затрат (23 працэнты), падзенне якасці прадукцыі (22 працэнты) і скарачэнне інавацыйных распрацовак (8 працэнтаў).

**Захар БУРАК.**

# ЦУКАР ЯК НАРКОТЫК

## Пра шкоду для здароўя і след у гісторыі прадукта, які выклікае мацнейшую за какаін залежнасць

**Даследчыкі пішуць, што эфект ад ужывання цукру падобны да ўплыву какаіну. Ён змяняе настрой, стымулюючы пачуццё асалоды, і правакуе чалавека на пошук салодкага. Навукоўцы спасылаюцца на вынікі даследавання паводзін грызуноў, якія паміж наркотыкам і цукрам часцей выбіралі апошні. Сёння на гэты прадукт навешана мноства ярлыкоў. З аднаго боку, словамі «салодкі», «цукровы» мы абазначаем з'явы і аб'екты пазітыўныя і прыемныя. З іншага — называем цукар «салодкай смерцю». Пра гісторыю яго з'яўлення і шлях ад задавальнення для багатых да самага распаўсюджанага прадукту на паліцах, а таксама пра яго ўплыў на здароўе размаўляем з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Гуменам ГАРБАННІДЖАДАМ.**



— Калі мы ў магазіне бяром пачак цукру, у розных людзей узнікаюць розныя асацыяцыі — пачынаючы ад чаго-небудзь смачненькага да бразільскіх серыялаў, рабства, рому і шмат чаго іншага. З цукрам звязана шмат падзей у гісторыі.

З-за цукру загінулі мільёны чалавек, шмат людзей зарабілі на ім багацце, і да цяперашняга часу вядуцца закулісныя войны за рынак цукру па ўсім свеце. Многія хацелі б атрымаць як мага большую яго частку і зарабляць на гэтым. Цукар — прыбытковы бізнес і адзін з рэдкіх відаў наркотыкаў, гандаль якім легалізаваны ва ўсім свеце.

***— Давайце пачнём з гісторыі цукру. Яго радзімай лічаць Індыю...***

— Першыя сляды выкарыстання цукровага трыснягу былі знойдзены ў Папуа-Новай Гвінеі. Менавіта там яго ўжывалі яшчэ дзесяць тысяч гадоў таму. Але цукар тады выкарыстоўваўся як лекі і не меў такога шырокага распаўсюджання, бо вырошчваць і здабываць яго было цяжка. Каля трох тысяч гадоў таму цукровы трыснёг трапіў у Індыю. Але там таксама лічылі, што ён мае лекавыя ўласцівасці. Пакуль персідскі цар Дарый не захапіў Індыю.

Але і ў Персіі цукар не атрымаў вялікай папулярнасці, яго таксама выкарыстоўвалі як лякарства. Падчас ісламскіх войнаў цукровы трыснёг трапіў у Іспанію, а адтуль распаўсюдзіўся ў Еўропе. Еўрапейцы таксама не надта яго віталі. Гэта было дарагое задавальненне, цукар лічыўся прадуктам для багатых. У 1069 годзе ён з'явіўся ў Англіі. У той час еўрапейскія багацеі называлі яго «белым золатам». Калі прыходзіла шмат гасцей, з цукру рабілі розныя скульптуры. Гэта ўпрыгожвала стол і сведчыла пра багацце чалавека. Але яго не ўжывалі ў вялікай колькасці.

Іспанцы і партугальцы вырашылі ўкараняць цукар у культуру харчавання. Іспанцы пачалі вырошчваць капрызны цукровы трыснёг на Канарскіх астравах, гэта было бадай адзінае прыгоднае месца. Калі Хрыстафор Калумб у 1492 годзе пайшоў у бок Амерыкі, ён узяў з сабой цукровы трыснёг. І на новым кантыненце той добра вырас, бо надвор'е і глеба аказаліся спрыяльнымі.

Аднак атрымаць цукар з трыснягу — вельмі цяжкая работа, і ахвотных займацца ёй было няшмат. Таму іспанцы ўжо ў той час выкарыстоўвалі рабскую працу. На Канарскіх астравах працавалі мясцовыя жыхары. І калі іспанцы прыйшлі ў Амерыку, спачатку цукровы трыснёг апрацоўвалі індзейцы, пакуль іспанскі кароль не забараніў іх працу на плантацыях. Тады было вырашана завозіць афрыканцаў. Партугальцы пачалі прывозіць рабоў з Афрыкі. Каля 12 мільёнаў цёмнаскурых былі перавезены для работы на плантацыях цукровага трыснягу.



Яны працавалі па 18 гадзін у суткі. Гэта была цяжкая праца, да таго ж пра рабоў дрэнна клапаціліся. Сярэдняя працаглясць іх жыцця на плантацыях складала не больш чым сем гадоў. Таму ўвесь час патрабаваўся прыток новай працоўнай сілы. Атрымліваўся добры бізнес: прывезці рабоў, абмяняць іх на цукар ці на ром (гэта гарэлка, атрыманая з цукровага трыснягу), потым прадаць цукар і ром, што прыносіла вялікі прыбытак гандлярам рабамі і вытворцам цукру.

Рабская праца з часоў шумерскай цывілізацыі (ёсць гістарычныя факты, што яны выкарыстоўвалі працу палонных) мела на ўвазе працу мясцовых жыхароў. У Амерыку ж рабоў прывозілі з Афрыкі. Умовы іх дастаўкі былі крайне жорсткімі. Адзін раб на судне павінен быў займаць месца не больш, чым у труне. Была цэлая схема, як размеркаваць рабоў на судне, каб змясціць іх максімальную колькасць. Час дастаўкі займаў ад паўтара да пяці месяцаў. Увесь гэты час людзі знаходзіліся на месцы, спраўляць патрэбу маглі толькі пад сябе, атрымлівалі самую прымітыўную ежу і мінімальную колькасць вады.

Таму вялікая колькасць рабоў гінула з-за кішэчных інфекцый і іншых хвароб па дарозе, іх выкідалі за борт. Гаспадар брытанскага судна Лук Куленвуд у 1781 годзе выкінуў за борт сотні жывых рабоў, каб даставіць астатніх у спадзяванні атрымаць кампенсацыю, бо быццам бы на судне не хапала вады, каб іх напаіць. Кампенсацыю ён не атрымаў, бо ўстанавілі, што на караблі было 1500 літраў вады, і гэтага б хапіла, каб усіх напаіць. Такога жорсткага абыходжання з людзьмі, як у той час, гісторыя не ведала.

У той час рэлігіі мелі вялікі ўплыў, і ні адна з іх не забараніла рабства, некаторыя нават адабралі. Напрыклад, іўдаізм прапаведаваў такія погляды: не глядзі на свайго суседа, жонку суседа і на яго раба. Згодна з ісламам, усе пленныя былі рабамі, і пераможцы маглі рабіць з імі, што хацелі. Хрысціянства таксама рабства не забараніла, хоць і гаварыла пра духоўнае братэрства перад Богам. Некаторыя рэлігіі лічылі, што цёмнаскурыя людзі за свае грахі расплачваюцца цёмным колерам скуры.

У жывёльным свеце ёсць эксплуатацыя сабе падобных. Адна калонія мураўёў можа выкарыстоўваць працу іншых сабе на карысць. Некаторыя прыматы могуць жорстка абыходзіцца з іншымі, нават забіваць іх. Але так жорстка эксплуатаваць сабе падобных можа толькі чалавек.

У XXI стагоддзі замест рэлігійных законаў мы выкарыстоўваем дзяржаўныя. І нягледзячы на тое што рэлігія не забараняе рабства, яно з'яўляецца незаконным і ў большасці краін забаронена. У кожнай рэлігіі свае законы: у нейкай нельга ўжываць спіртное, мяса, у іншай — можна; у адной нельга скасоўваць шлюб, у іншай дазволена мнагажонства, і кожная рэлігія пацвярджае, што гэта сказаў Бог. Падстройвацца пад кожную рэлігію немагчыма, таму дзяржаўныя законы ствараюцца, зыходзячы з сучасных юрыдычных практык.

Трэба сказаць, што ў цяперашні час многія кланы, якія маюць вялікі ўплыў і вялікія грошы, свой першапачатковы капітал атрымалі за кошт гандлю рабамі і цукрам. Але рабства працягваецца да цяперашняга часу, нягледзячы на тое, што ў большасці краін забаронена. Яно перайшло з аднаго віда ў іншы.

Калі раней рабства абаранялася мячом ці бізуном і іншай зброяй, цяпер яно перайшло ў новы від — «перасела з танкаў на банкі». У адных краінах друкуюць долары, па сутнасці, проста паперы, а іншыя працуюць за кошт гэтых папер. Людзі, якія перажылі развал Савецкага Саюза, ведаюць, што такое абясцэньванне грошай і працы. І да цяперашняга часу гэта страшная зброя, якую можна павярнуць супраць краін другога і трэцяга свету, калі яны будуць непаслухмяныя, з дапамогай санкцый і іншых спосабаў. Рабства не скончылася, проста з адкрытай формы перайшло ў закрытую.

***— Як цукар з прадукту для багатых ператварыўся ў цалкам даступны?***

— Лішак вытворчасці прывёў да зніжэння кошту. Людзі пачалі масава яго выкарыстоўваць. На карцінах Сярэднявечча, дзе намаляваны заможныя людзі, ні адзін з іх не ўсміхаецца, бо з-за цукру зубы былі ў жудасным стане. Тым больш што ў тыя часы толькі багатыя маглі выкарыстоўваць цукар.

У 1920 годзе вытворцы зразумелі, што можна прадаць не толькі цукар, але і яго вытворчасць. І пачалі змешваць яго з какавай, мукой, напоямі, дадаваць фарбавальнікі, хімічныя дабаўкі. Цукар пачаў выкарыстоўвацца ў вялікай колькасці прадуктаў, нават там, дзе мы яго не адчуваем: каўбасах, сасісках, розных паўфабрыкатах.

З часам навукоўцы і медыкі прыйшлі да высновы, што цукар — вельмі небяспечнае хімічнае злучэнне. І ў 2006 годзе Сусветная арганізацыя аховы здароўя ўнесла цукар у спіс псіхатропных рэчываў. Бо было ўстаноўлена, што, калі мы ўжываем цукар, у кары галаўнога мозгу актывізуюцца тыя ж зоны, што і пры ўжыванні наркотыкаў.

Залежнасць ад цукру па шэрагу параметраў у 7-8 разоў мацней, чым ад какаіну. Цукар стымулюе выпрацоўку ў мозгу аптыёідаў і дафаміну — гармону радасці. Залежнасць ад цукру дастаткова моцная. Але ніхто пра тое гучна не заяўляе, бо гэта шматмільярдны бізнес, распаўсюджаны па ўсім свеце.

***— На што найперш уплывае празмернае ўжыванне цукру?***

— Няма месца ў арганізме, куды б цукар не дабраўся і не прынёс шкоду. Нават валасы выпадаюць ад злоўжывання цукрам. У роце ён вядзе да карыесу, у печані — да гепатозу, у сасудах — да атэрасклерозу і гіпертаніі, у падстраўнікавай залозе — да цукровага дыябету, у сэрцы — да ішэмічнай хваробы, у галаўным мозгу — да неўралагічных парушэнняў і дэменцыі. Для вачэй гэта пагаршэнне зроку і катаракта, для суставаў — артрыт і артроз, для скуры — прышчы і акне. Акрамя таго, цукар у нашым арганізме — гэта прычына ракавых захворванняў. Цукар мае ўплыў і на імунную сістэму: яна, пакуль не паглыне цукар, не пачне змагацца з чужароднымі вірусамі і бактэрыямі. Таму калі мы ўжываем цукар, то ставім імунную сістэму на паўзу. З гэтай прычыны, калі мы хварэем, не рэкамендуецца ўжываць шмат салодкага. Акрамя таго, цукар — гэта лішнія калорыі і атлусценне. З якога боку ні паглядзім, цукар ніякай карысці для нашага арганізма не нясе.

***— Атрымліваецца, яго ўвогуле нельга ўжываць? Ці ўсё ж ёсць нейкая дазволеная доза?***

— Нягледзячы на ўсе шкодныя наступствы, якія ён выклікае, амерыканская асацыяцыя кардыёлагаў рэкамендуе ўжываць мужчынам не больш за 36 грамаў у суткі, жанчынам — 25 грамаў. Нядаўна даказана, што вялікае спажыванне цукру вядзе не толькі да захворвання печані і сэрца, а нават з'яўляецца прычынай парушэння ліпіднага абмену і росту дрэннага халестэрыну.

Акрамя таго, падчас ужывання цукру выпрацоўваецца вялікая колькасць інсуліну, а ён затрымлівае ваду і натрый у нырках, што з'яўляецца прамой прычынай павелічэння артэрыяльнага ціску. Апроч таго, салодкае можа выклікаць сіндром дэфіцыту ўвагі і гіперактыўнасці, — парушэнне мазгавой дзейнасці, для якога характэрна стабільная страта ўвагі і канцэнтрацыі. Увогуле, дзеці пасля ўжывання вялікай колькасці салодкага пачынаюць паводзіць сябе больш агрэсіўна і надзвычай актыўна.

Але калі выключыць ужыванне цукру, гэта выкліча масавую дэпрэсію ці масавую агрэсію, бо гэта разнавіднасць наркотыка, прычым легалізаваная. Паколькі мы ўжываем яго з дзяцінства, то не ўяўляем, як можна пражыць без цукру. Людзі, якія доўгі час ужываюць салодкае, адчуваюць нешта падобнае да ломкі, як у наркамана, калі перастаюць яго есці. Мозг выпрацоўвае менш дафаміну, чалавек становіцца больш нервозным і агрэсіўным. Акрамя гэтага, вялікае спажыванне салодкага выклікае нестабільны эмацыянальны стан: узмацняе і добры, і дрэнны настрой.

Па вялікім рахунку на любым пачку цукру варта пісаць, што празмернае яго ўжыванне шкодзіць здароўю. Але ў кожнай краіне на цукры штогод зарабляюць мільярды, таму яго негатыўны ўплыў абмяркоўваецца неахвотна.

***— Як сысці ад цукровай залежнасці?***

— Замест цукру можна выкарыстоўваць мёд. Але ён таксама мае высокую каларыйнасць і выклікае атлусценне і пэўныя ўскладненні ў нашым арганізме. Лепш перайсці на натуральныя цукры: фрукты, сухафрукты, але таксама ва ўмеранай колькасці. Вялікае ўжыванне цукру, у якім бы выглядзе ён ні быў, шкодна.

**Алена КРАВЕЦ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

**Организатор аукциона –**

## РУП «Белтелеком» в лице Брестского филиала,

**расположенного по адресу: г. Брест, пр-т Машерова, 21-2**

На аукцион выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества, которое представляет собой:

**Лот 1: Помещение на 1-м этаже в изолированном помещении (автоматизированная телефонная станция) общей площадью 17,8 кв. м по ул. Жукова, д. 16/2, пом. 1, в г. Барановичи Брестской области:**
1.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:
1БАВ * 0,25 * 17,8 = **4,45 БАВ.**

**Лот 2: Помещение на 1-м этаже в изолированном помещении (автоматизированная телефонная станция) общей площадью 11,4 кв. м по ул. Жукова, д. 16/2, пом. 1, в г. Барановичи Брестской области:**
2.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:
1БАВ * 0,25 * 11,4 = **2,85 БАВ.**

**Лот 3: Помещение на 1-м этаже в изолированном помещении (автоматизированная телефонная станция) общей площадью 46,9 кв. м по ул. Жукова, д. 16/2, пом.1, в г. Барановичи Брестской области:**
3.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:
1БАВ * 0,25 * 46,9 = **11,725 БАВ.**

**Лот 4: Помещение на 1-м этаже в изолированном помещении (автоматизированная телефонная станция) общей площадью 22,8 кв. м по ул. Жукова, д. 16/2, пом. 1, в г. Барановичи Брестской области:**
4.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:
1БАВ * 0,25 * 22,8 = **5,7 БАВ.**

**Лот 5: Помещение на 1-м этаже в изолированном помещении (автоматизированная телефонная станция) общей площадью 24,8 кв. м по ул. Жукова, д. 16/2, пом. 1, в г. Барановичи Брестской области:**
5.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:
1БАВ * 0,25 * 24,8 = **6,2 БАВ.**

**Лот 6: Помещения на 1-м этаже в изолированном помещении (автоматизированная телефонная станция) общей площадью 46,1 кв. м по ул. Жукова, д. 16/2, пом. 1, в г. Барановичи Брестской области:**
6.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:
1БАВ * 0,25 * 46,1 = **11,525 БАВ.**

**Лот 7: Помещения на 1-м этаже в изолированном помещении (автоматизированная телефонная станция) общей площадью 39,9 кв. м по ул. Жукова, д. 16/2, пом. 1, в г. Барановичи Брестской области:**
7.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:
1БАВ * 0,25 * 39,9 = **9,975 БАВ.**

Срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи права и задатка согласно п. 7.2 Положения о порядке определения размера арендной платы, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 16.05.2023 № 138; коэффициент – 2,5, целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

Аукцион состоится **23 января 2024 года в 14.00** по адресу: 224030, г. Брест, пр-т Машерова, 21-2 в малой студии Брестского филиала РУП «Белтелеком».

Документы на участие в аукционе принимаются **с 26 декабря 2023 года по 22 января 2024 года** в рабочее время с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 224030, г. Брест, пр-т Машерова, 21-2, каб. № 416.

**Для участия в аукционе участник аукциона в срок, установленный для приема документов:**

- перечисляет задаток на р/с Брестского филиала РУП «Белтелеком» № BY26AKBB30121001100011000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» (BIC)-AKBBBY2X, УНП 201003265.
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- представляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

**Телефон для справок (8-0162) 22-10-20, тел./факс 22-15-42.**

---

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению строительного унитарного предприятия «Житковичская передвижная механизированная колонна № 97» ОАО «Полесьестрой» (продавец) извещает о проведении 24 января 2024 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 335/С-6488** общей площадью **918,0 кв. м,** наименование – **здание ремонтных мастерских, одноэтажное, кирпичное; Капитальное строение с инв. № 335/С-6448** общей площадью **119,0 кв. м,** наименование – **здание лесосушилки, одноэтажное, кирпичное; капитальное строение с инв. № 335/С-6481** общей площадью **320,0 кв. м,** наименование – **здание лесопильного цеха, одноэтажное, кирпичное; капитальное строение с инв. № 335/С-6482** общей площадью **1 187,0 кв. м,** наименование – **здание столярного цеха, одноэтажное, кирпичное; капитальное строение с инв. № 335/С-6484** общей площадью **211,0 кв. м,** наименование – **здание котельной, одноэтажное, кирпичное; капитальное строение с инв. № 335/С-6483** общей площадью **161,0 кв. м,** наименование – **здание гаража, одноэтажное, кирпичное; капитальное строение с инв. № 335/С-6445** общей площадью **358,0 кв. м,** наименование – **здание материального склада, одноэтажное, кирпичное; капитальное строение с инв. № 335/С-6486**, общей площадью **424,0 кв. м,** наименование – **здание гаража, одноэтажное, кирпичное; капитальное строение с инв. № 335/С-6487** общей площадью **760,0 кв. м,** наименование – **здание РБУ, одноэтажное, кирпичное; капитальное строение с инв. № 335/С-98716** общей площадью **40,3 кв. м,** наименование – **трансформаторная подстанция; капитальное строение с инв. № 335/С-6485** общей площадью **188,0 кв. м,** наименование – **здание автовесовой, одноэтажное, кирпичное; капитальное строение с инв. № 335/С-6479** общей площадью **322,0 кв. м,** наименование – **здание склада сыпучих материалов, одноэтажное, кирпичное**; **капитальное строение с инв. № 335/С-6478** общей площадью **195,0 кв. м,** наименование – **Здание центрального склада, одноэтажное, кирпичное; капитальное строение с инв. № 335/С-6447** общей площадью **116,0 кв. м,** наименование – **здание склада, одноэтажное, кирпичное**; **капитальное строение с инв. № 335/С-789598** общей площадью **12 721,6 кв. м,** наименование – **площадка асфальтобетонная; капитальное строение с инв. № 335/С-789848**, наименование – **забор бетонный**.<br>Адрес: Гомельская обл., Петриковский р-н, г. Петриков, ул. Первомайская, 75.<br>Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером **324350100002000706** общей площадью **4,7772 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственной базы | **1 312 080,00** | 131 208,00 |

**Продавец:** Строительное унитарное предприятие «Житковичская передвижная механизированная колонна № 97» ОАО «Полесьестрой», 247953, г. Житковичи, ул. Фрунзе, 77.

**Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляется по контактному тел. 8 (044) 787-07-06, Михаил Альбертович.**

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов** (Унитарное предприятие «Житковичская ПМК-97» ОАО «Полесьестрой»): р/с BY03AKBB30120291515593300000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 490873012, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 23 декабря 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 22 января 2024 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения.

